НЕ ПРАДАЕЦЦА ХАТА БАЦЬКОЎ! ЦІ ПРАДАЕЦЦА?

6

ЯК НЕ ЛЮБІЦЬ НАШУ ЛЮБЧУ!

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 115 (29737)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРОТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў асабовы склад і ветэранаў 60-га асобнага Баранавіцкага Чырванасцяжнага ордэна Аляксандра Неўскага палка ў сувязі з 80-годдзем з дня ўтварэння.**
- Другую кнігу народнага летапісу Вялікай Айчыннай вайны прэзентавалі ў Мінску.
- **ДАІ рэкамендуе ў дажджлівае надвор'е быць вельмі ўважлівымі.**
- Гарады Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей сталі лідарамі па азеляненні.
- **У чэмпіянаце Беларусі сярод ветэранаў парашутнага спорту ў Віцебску будуць удзельнічаць 40 чалавек.**
- Па праграме «Сямейны капітал» адкрыта ўжо больш за 114 тысяч дэпазітаў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ, першы сакратар ЦК БРСМ:

«Гэтымі днямі беларускія студэнцкія атрады праводзяць работы па рэстаўрацыі на тэрыторыі дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Маладыя людзі дэманструюць сваю перакананасць і стаяць, па сутнасці, на абароне нашых гістарычных рубяжоў. Беларусь ідзе ў авангардзе гэтых падзей. Моладзі многіх краін неабходна аб'яднацца і выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю ў адносінах да захавання гістарычнай памяці. І, вядома, святая беларуская зямля — жывы помнік гісторыі, найперш Вялікай Айчыннай вайны».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НЕЛЬГА ЗАМЫКАЦЦА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕЖАХ. ГЭТА НЕ ДАСЦЬ ПАТРЭБНАГА ЭФЕКТУ»

Фота БелТА.

Перспектывы мікраэлектронікі абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную стану і развіццю мікраэлектронікі. З дакладамі па тэме выступілі міністр прамысловасці Пётр Пархомчык і Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў. Перад нарадай кіраўніку дзяржавы на спецыяльнай выстаўцы паказалі прыклады распрацовак у галіне мікраэлектронікі. А пасля шырокім саставам абмеркавалі развіццё гэтай галіны з яе праблемамі і перспектывамі.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2022

У МАБІЛЬНІКУ НЕЛЬГА ЗНАЙСЦІ АДКАЗЫ НА ЗАДАННІ ЦТ,

або Як не пазбавіцца статусу абітурыента яшчэ на старце?

Згодна з народнай прыкметай, дождж у дарогу — да поспеху, гэта значыць, што ўсё, што запланавалі, будзе ўдалым. Напярэдадні старту ў краіне цэнтралізаванага тэсціравання ўсю ноч ішоў дождж. І падчас экзамену ён таксама гучна барабаніў па падваконнях. Затое невыносная спёка, нарэшце, адступіла, і абітурыенты, якія прыйшлі здаваць у гэты дзень беларускую мову, адчувалі сябе даволі камфортна. Побач з галоўным будынкам Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта бліжэй да дзесяці гадзін раніцы было ўжо шматлюдна. Самыя дысцыплінаваныя абітурыенты прыйшлі нашмат раней. Па ненапружанай атмасферы і адсутнасці груп падтрымкі ў выглядзе бацькоў адчувалася, што працэдура цэнтралізаванага тэсціравання абітурыентам добра знаёмая. Усё ж такі цяпер можна шматразова «трэніравацца» і афлайн, і анлайн.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Для Анастасіі Дзюмінай, якая прыйшла ў БДМУ здаваць беларускую мову, гэта ўжо другая спроба паступіць на ўпадабаную спецыяльнасць. Дзяўчына марыць развівацца далей у галіне правазнаўства. Летась яна здавала цэнтралізаванае тэсціраванне і па рускай, і па беларускай мовах. Дарэчы, вынік іспыту па беларускай мове аказаўся вышэйшы. Спадзяецца, што ў гэтым годзе атрымае яшчэ большую колькасць балаў. Але на ўсялякі выпадак вырашыла падстрахавацца і здаць таксама ЦТ па рускай мове, каб потым выбраць лепшы сертыфікат. Такая магчымасць у абітурыентаў ёсць — здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны.

Дарэчы, сёлета на цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове зарэгістравалася па краіне крыху больш за 18 тысяч чалавек. А рускую мову плануе здаваць больш за 50,3 тысячы чалавек.

СТАР. 5

КАЛІ ВАДА — БЯДА

За мінулы тыдзень на вадаёмах краіны загінулі 29 чалавек

Выхадныя, як гэта часта бывае ў спёку, для ратавальнікаў выдаліся неспакойныя. За два дні (11 і 12 чэрвеня) — 13 абарваных жыццяў, у тым ліку адно дзіцячае. А колькі трагедый дзякуючы супрацоўнікам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Таварыства ратавання на водах, а таксама неабыякавым грамадзянам удалося пазбегнуць!

Без прыкмет жыцця...

З прыходам лета трагедыі на вадзе, на жаль, паўтараюцца. І ў гэтым, за рэдкім выключэннем, вінаватыя самі людзі. Не заўсёды тыя, хто заходзіць у ваду, разумеюць усю небяспеку, якую хавае ў сабе вадаём. Асабліва рызыкуюць — уступаюць у дуэль са смерцю — нецвярозыя. Іншыя плывуць на далёкія адлегласці, недаацэньваючы свае сілы і асаблівасці вадаёма. Гібель на вадзе дзяцей — у першую чаргу адказнасць бацькоў, якія не дагледзелі, адпусцілі, не пракантралявалі.

Паводле аператыўнай інфармацыі Таварыства ратавання

на водах, штогод у Беларусі гіне вялікая колькасць людзей: за мінулы год ахвярамі сталі 486 чалавек, у тым ліку 43 дзіцяці. З пачатку гэтага года на вадаёмах загінула амаль 130 чалавек.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«НЕЛЬГА ЗАМЫКАЦЦА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕЖАХ. ГЭТА НЕ ДАСЦЬ ПАТРЭБНАГА ЭФЕКТУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Так званая рынкавая свабода — гэта пусты гук. Ніякай свабоды рынкавай і ніякага рынку няма. Усе клапоцяцца пра свае інтарэсы, абараняюць свае інтарэсы накалькі гэта магчыма. Палітычны ціск і гандлёвыя войны перараслі ў гібрыднае супрацьстаянне. Нам штодзень даводзіцца змагацца за суверэнітэт і бяспеку краіны. І паралельна нарошчваць кампетэнцыі, разлічваць у поўнай меры мы можам толькі на сябе, на сяброўскія краіны, такія як Расія», — сказаў беларускі лідар. Ён акцэнтаваў увагу, што на гэтым фоне наданне новага імпульсу развіццю мікраэлектроннай прамысловасці актуальнае як ніколі. «Гэта разумеем і мы, і тыя, хто метадычна выбудоўвае бар'еры для набыцця электроннага начынння з-за мяжы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, у глабальным свеце навука і вытворчасць па асобных кірунках сталі шчыльна інтэграваныя і інтэрнацыянальныя. Таму трэба паскарацца, каб калі не дагнаць перадавыя краіны, то вырабіць у сябе крытычна важны прадукт і не залежаць ад імпарту.

Прэзідэнт нагадаў, што да распаду СССР мікраэлектроніка, зробленая на тэрыторыі нашай рэспублікі, была супастаўная па функцыянале і надзейнасці з таварамі кампаній, якія зараз дамінуюць на сусветным рынку. Беларусь і сёння не страціла перадавых пазіцый у свеце па шэрагу напрамкаў высокатэхналагічнай вытворчасці. Але кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што па шэрагу накірункаў беларуская мікраэлектроніка адстала.

Ад залежнасці лепш сыходзіць

«Нашы прадпрыемствы і распрацоўшчыкі прапануюць комплексныя рашэнні з высокай насычанасцю — мікраэлектроннымі кампанентамі ў сферы касмічнай оптыкі, рэнтгенаграфіі, неразбуральнага кантролю, зандзіравання атмасферы Зямлі. Спіс можна працягваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы пералічыў сферы, дасягненнямі ў якіх могуць ганарыцца беларускія спецыялісты. Традыцыйна моцная беларуская фундаментальная школа аптычнай (лазернай) фізікі. Айчынны патэнцыял дэманструюць перш за ўсё дасягненні ваенна-прамысловага комплексу. Беларускія радыёлакацыйныя сістэмы рознага прызначэння здольныя даць дакладнае цэлеўказанне па любых, нават самых распіяраных сродках нападзення. Прычым у любое надвор'е і на любых вышынях. Беларусь — у ліку сусветных лідараў па сродках радыёэлектроннай барацьбы. Многае зроблена ў сферы вытворчасці беларускай «разумнай» беспілотнай тэхнікі.

«Нашы распрацоўкі здольныя здзівіць і галоўнае — ацверазіць людзей, якія выношваюць агрэсіўныя планы адносна Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы ў цэлым. Аднак нават у абароннай сферы мы пакуль яшчэ залежым ад імпартных кампанентаў. Асабліва тых, якія мы ніколі не будзем вырабляць у Беларусі з прычыны таго, што яны нам патрэбныя адзінкавыя. Стварацъ вялізныя заводы за мільярды долараў, каб сябе забяспечыць, — гэта проста нерэнтабельна. Мы ніколі такі завод не акупім на гэтых адзінкавых элементах», — заўважыў Прэзідэнт. І канстатаваў, што ў цяперашніх умовах там, дзе гэта магчыма, ад падобнай залежнасці лепш сыходзіць.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што на аснове ўласных рашэнняў павінны працаваць і нацыянальныя дата-цэнтры, і вузлы апрацоўкі банкаўскіх аперацый, і сродкі маніторынгу грамадскай бяспекі. Па яго словах, у Беларусі ёсць кадравы патэнцыял, навуковы зачын. Гэта галоўнае. Цяпер патрэбна канцэнтрацыя ўсіх сіл на рашэнні стратэгічных задач. Пэўныя крокі зроблены.

«Як мне дакладваюць, вядучыя структуры, якія валодаюць кампетэнцыямі, сфарміравалі на пляцоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кластар «Мікра-, опта і ЗВЧ-электроніка». Распрацаваны праект канцэпцыі развіцця ў нашай краіне даследаванняў і распрацовак у галіне стварэння экспартарыентаванай і імпартазамяшчальнай электроннай кампанентнай базы. Гэтую ініцыятыву падтрымлівае ўрад. Добра. Але нельга замыкацца ў нацыянальных межах. Гэта не дасць патрэбнага эфекту», — сказаў беларускі лідар.

Узровень цікавасці каласальны

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што трэба супрацоўнічаць не толькі з тымі краінамі, дзе беларусаў чакаюць з распасцёртымі абдымкамі, як у Расіі. Але і там, дзе беларусаў не чакаюць, — трэба супрацоўнічаць з амерыканцамі, японцамі. Хоць бы для таго, каб бачыць найвышэйшы ўзровень, да якога імкнуцца.

«Работу трэба весці ў цесным супрацоўніцтве з Расіяй. Мы не хаваем наш інтарэс у гэтым плане. Таму што рэалізаваць усе напрацоўкі, якія ў нас ёсць, навуковыя, доследна-канструктарскія элементы магчыма толькі дзякуючы своечасоваму фінансаванню. Расія гатова фінансаваць нас у гэтым плане. Прынамсі, мы з прэзідэнтам Пуціным шмат разоў пра гэта гаварылі і прыйшлі да адназначнай высновы. Пры мне ён даручыў віцэ-прэм'еру Юрыю Барысаву заняцца гэтым пытаннем. Дзверы адчыненыя — калі ласка, давайце будзем працаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўзровень цікавасці каласальны. Сёння ўжо нікога не трэба пераконваць у неабходнасці ценаў кааперацыі, як гэта было раней, калі размова ішла аб энергетыцы, сельгасмашынабудаванні, вытворчасці аўтакампанентаў.

Прэзідэнт выказаў меркаванне, што патрэбны беларуска-расійскі орган па каардынацыі сумесных работы, які б функцыянаваў пастаянна. «Трэба сур'ёзна падумаць аб каардынацыі нашай працы і хто будзе ёю займацца», — падкрэсліў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ракеты, самалёты павінны лятаць, нягледзячы на ціск. Таксама ён пацікавіўся, як ідзе работа па імпартазамяшчэнні ва ўмовах санкцый. Прэзідэнт пацікавіўся: што можна зрабіць, як хутка, якія патрабуюцца рашэнні і рэсурсы?

«Цяпер для вас, як і для іншых галін, — шанц. Чаму? Мы вельмі запатрабаваныя, перш за ўсё ў нашай брацкай Расіі. У Беларусі няхай няшмат, але вы робіце ўсё неабходнае, дапусцім, для тэхнікі нашай. Да таго ж пад гэта выдзяляецца вялізнае фінансаванне, перш за ўсё Расіяй. Калі ласка, дзверы адчыненыя — працуйце. Вазьміце гэтыя грошы і зрабіце канкурэнтаздольны тавар», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да ўдзельнікаў нарады.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

У нас з'яўляецца ўнікальная сітуацыя і ўжо ёсць патэнцыял

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам удзельнікі нарады раскрылі журналістам яе некаторыя дэталі. Па словах **міністра прамысловасці Пятра ПАРХОМЧЫКА,** Прэзідэнт задаволены той работай, якую выканалі Міністэрства прамысловасці і Нацыянальная акадэмія навук. Але ў той жа час Прэзідэнт адзначае, што трэба выходзіць на больш высокія тэхналагічныя нормы. «У нас з'яўляецца такая ўнікальная сітуацыя, калі ўсё, што вырабляе Міністэрства прамысловасці ў галіне мікраэлектронікі, запатрабавана на расійскім рынку. На сёння нашы прадпрыемствы паспяхова загружаны, вельмі добрыя паказчыкі. Той жа «Інтэграл» працуе з тэмпам 130 працэнтаў да ўзроўню мінулага года. У найбліжэйшы час мы яшчэ дададзім абаротаў і прырасцём у паказчыках. Гэта звязана з тым, што з'явіліся новыя заказы. Усё тое, што рабілася і пастаўлялася ў Расійскую Федэрацыю з недружалюбных краін, Расія гатова перадаць для вытворчасці на нашы прадпрыемствы», — расказаў міністр.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ адзначыў, што сёння ні адну галіну, ні адно прадпрыемства нельга разглядаць у перспектыве без тэхналогій і мікраэлектронікі. «Мы паказалі на выставе нашы распрацоўкі. Але разумеем, што гэтага не хапае. Сёння трэба яшчэ больш актыўна працаваць, канцэнтраваць рэсурсы і навуковыя, і матэрыяльныя. Ёсць шанц інтэгравацца з Расійскай Федэрацыяй. Расія распрацавала стратэгію развіцця мікраэлектронікі да 2030 года. Мы распрацавалі канцэпцыю развіцця мікраэлектронікі ў нашай краіне, і нам таксама трэба аператыўна распрацоўваць праграму развіцця мікраэлектронікі. У нас, канешне, ёсць навуковыя праграмы. І мы атрымліваем добры прадукт. Але разумеем, што маштабу не хапае. І ў сувязі з гэтым нам пастаўлена задача імпартазамяшчэння. Патэнцыял у нас ёсць, і мы гатовы пайсці шляхам імпартазамяшчэння», — сказаў ён.

Уладзімір Гусакоў падкрэсліў, што ў краіне створана добрая база для развіцця мікраэлектронікі і ў прамысловасці, і ў навуцы. Сёння трэба яе ўмацоўваць і развіваць. І самае галоўнае — трэба атрымліваць найноўшыя прадукты, якія па сваёй канкурэнтаздольнасці і патэнцыяле не будуць саступаць замежным аналагам. «Вядома, мы разумеем: каб дасягнуць нанапамераў мікрасхем, якія ёсць у ЗША ці ў Японіі, неабходныя вялікія сродкі. Гэта задача не аднаго дня. Да гэтага трэба рухацца. Патэнцыял у нас ёсць. Ёсць абяцанні і Расійскай Федэрацыі фінансаваць гэтыя распрацоўкі, і будзем у гэтым напрамку развівацца і асвойваць гэтыя найноўшыя дасягненні», — адзначыў ён.

Акцэнты

НА ВАРЦЕ ПРАЎДЫ І ПАМЯЦІ

У Мінску абмяркоўваюць пытанні недапушчэння рэабілітацыі нацызму і гераізацыі фашысцкіх злачынцаў, супрацьстаяння фальсіфікацыям падзей Вялікай Айчыннай вайны

У міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», арганізаванай Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пры садзейнічанні Генеральнай пракуратуры, Міністэрства абароны, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай акадэміі навук, удзельнічаюць парламенцкія дэлегацыі з Арменіі, Казахстана, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана і Узбекістана, прадстаўнікі інтэграцыйных структур СНД, АДКБ, Саюзнай дзяржавы, замежныя дыпламаты, навуковая і экспертная супольнасць.

Як адзначыў падчас цырымоніі ўскладання вянка і кветак да манумента Перамогі **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** яшчэ некалькі гадоў таму мы не маглі падумаць, што нам прыйдзецца адстойваць гістарычную праўду і памяць. «Мэта гэтай канферэнцыі — заявіць аб недапушчальнасці перапісвання гісторыі, паказаць тую небяспеку, якую ўсяму свету нясе рэабілітацыя нацызму, і, вядома, прадэманстраваць тую вялікую работу, якая праводзіцца ў Беларусі па захаванні гістарычнай памяці і гістарычнай праўды, — удакладніў спікер ніжняй палаты парламента. — Правядзенне гэтай канферэнцыі будзе садзейнічаць прызнанню і асуджэнню міжнароднай супольнасцю генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама падчас канферэнцыі мы абмяняемся заканадаўчым вопытам па гэтых пытаннях, абгаворым, як узмацніць наша парламенцкае ўзаемадзеянне па супрацьдзеянні той гібрыднай агрэсіі, якая сёння вядзецца супраць Рэспублікі Беларусь і іншых постсавецкіх дзяржаў».

Сваімі кампетэнтнымі меркаваннямі ўдзельнікі канферэнцыі падзяліліся на пяці тэматычных секцыях.

Ключавой тэмай секцыі «Злачынствы без тэрміну даўнасці», арганізаванай Генеральнай пракуратурай, стаў генацыд беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны. Прадстаўнікі Генпракуратуры падзяліліся ўласным вопытам і вынікамі расследавання справы аб генацыдзе беларускага народа, расказалі аб маштабных карных аперацыях фашыстаў, а таксама створаных нацыстамі на нашай тэрыторыі канцлагерах, лагерах смерці і іншых месцах прымусовага ўтрымлівання насельніцтва, звярнулі ўвагу на пытанне ўвекавечвання памяці ахвяр генацыду.

— Адраджэнне і распаўсюджванне ідэй нацызму, асабліва ў краінах заходняга вектара, сведчыць аб неабходнасці гаварыць пра недапушчальнасць генацыду зноў і зноў, — заўважыў **намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Максім ВАРОНІН.** — І не столькі гаварыць, а рабіць рэальныя крокі з мэтай яго недапушчэння. У ходзе расследавання крымінальнай справы выяўляюцца шматлікія новыя злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, устаноўлена звыш 400 новых месцаў масавага знішчэння людзей. Мы сёння працуем па ўсім свеце, накіроўваючы даручэнні аб прававой дапамозе з мэтай устанаўлення ваенных злачынцаў тых гадоў: пачынаючы ад краін Заходняй Еўропы, заканчваючы Аўстраліяй і Канадай. На жаль, шэраг краін, неабгрунтавана палітызуючы расследаванне гэтай крымінальнай справы, адмаўляюць нам у прававой дапамозе па надуманых абставінах. І, што здзіўляе, матывуючы гэта інтарэсамі нацыянальнай бяспекі іх краін. Асабліва гэта датычыцца прыбалтыйскіх дзяржаў. Генацыд з'яўляецца тым злачынствам, якое, у адпаведнасці з міжнароднай канвенцыяй, з'яўляецца злачынствам без тэрміну даўнасці. Асобы, якія маюць дачыненне да яго здзяйснення, павінны быць пакараны ў адпаведнасці з прынцыпам аб непазбежнасці пакарання.

Шырокае абмеркаванне разгарнулася ў мемарыяльным комплексе «Храм — помнік у гонар Усіх Святых» падчас секцыі «Вялікая Перамога ў грамадска-медыйным дыскурсе», ініцыіраванай Пастаяннай камісіяй па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

— Нашы ідэйныя апаненты на працягу многіх гадоў, калі не сказаць дзесяцігоддзяў, займаліся планамерна, мэтанакіравана работай, па-першае, па спусташэнні памяці (у першую чаргу ў маладога пакалення і пакалення сярэдняга ўзросту: праз СМІ, падручнікі, шматлікія гульнявыя формы), па-другое, па навязванні пэўнага альтэрнатыўнага пункту гледжання аб ролі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і адзінага савецкага народа, салдата-вызваліцеля ў Вялікай Перамозе, — акцэнтаваў увагу **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** — На жаль, часткова ім гэтая ідэя ўдалася. Мы можам назіраць інфармацыйны вакуум, які ўтварыўся ў мінулым дзесяцігоддзі ў людзей сярэдняга і малодшага ўзросту, запоўнены, мякка кажучы, альтэрнатыўнай, а калі праўдзіва, дэструктыўнай, шкоднай інфармацыяй з усялякай лухтой, чуткамі і трызненнямі. І гэта адбывалася на прычыне нашай з вамі недапрацоўкі.

Як падкрэсліў **намеснік старшыні Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Пётр ТАЛСТОЙ,** мы можам быць свабоднымі і моцнымі толькі тады, калі разам. «Мы павінны патлумачыць усяму свету спакойна і цярпліва, што мы — асобная цывілізацыя: у нас ёсць свой гістарычны вопыт, і, вядома, мы павінны быць разам у асэнсаванні гэтага гістарычнага вопыту, — заявіў удзельнік канферэнцыі. — Нашы краіны будуць і далей адстойваць гістарычную праўду. Немагчыма навязаць сваё бачанне свету, гісторыі ў адзін момант. Аднак той факт, што праз 80 гадоў мы працягваем шанаваць памяць тых, хто аддаў жыццё за нашу свабоду, за свабоду быць такімі, якія мы ёсць, і ні ў кога не пытаць дазволу, — вось што самае важнае».

Канферэнцыя працягваецца — 15 чэрвеня адбудзецца пленарнае пасяджэнне «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», падчас якога будзе прынята выніковая рэзалюцыя канферэнцыі. Падрабязнасці — у наступным нумары выдання.

Вераніка КАНЮТА.

КАЛІ ВАДА — БЯДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У аператыўных зводках — людзі рознага ўзросту, дастатку і стаўлення да жыцця. Следчыя і эксперты вызначаюць дакладныя прычыны ўсіх трагедый. Аднак нярэдка нават слоў відавочцаў дастаткова, каб зразумець, якім чынам развіваліся падзеі: ужыванне алкагольных напояў, жаданне паказаць свае фізічныя здольнасці, грэбаванне элементарнымі мерамі бяспекі.

Следства пакуль яшчэ не скончана, але ўжо ёсць падставы меркаваць, што менавіта па адной з гэтых прычын або па ўсіх адразу трагічна скончылася жыццё маладога мужчыны, які ў мінулую нядзелю патануў у рацэ Ушы ў Карэліцкім раёне на Гродзеншчыне. Экспертыза ўстановіць, што стала прычынай гібелі грамадзяніна 1963 года нараджэння, які ў той жа дзень загінуў у рацэ Уле каля вёскі Казаноўка Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці, а таксама пенсіянера, які патануў у вадаёме, што знаходзіцца ў аграгарадку Слабада на Мазыршчыне...

На Магілёўшчыне за адзін дзень — 11 чэрвеня — ахвярамі вады сталі два чалавекі. Выехаўшы ў раён вёскі Макровічы, што ў Бялыніцкім раёне, ратавальнікі ўжо ведалі, што ў сажалцы знойдзены труп чалавека. Прыбыўшы на месца, падраздзяленні МНС выцягнулі цела і канстатавалі смерць 70-гадовай мясцовай жыхаркі. Пасля абеду супрацоўнікі ведамства адправіліся на іншы выклік: ад мясцовага жыхара, які прыйшоў да вадаёма касіць траву, паступіў сігнал, што на беразе возера ў Дрыбіне ляжаць рэчы, а вось гаспадара няма. Вадалазы выявілі на дне вадаёма труп мужчыны і даталі яго з вады. Ім аказаўся 63-гадовы жыхар гарадскога пасёлка.

— У большасці выпадкаў надзвычайныя здарэнні з удзелам дарослых адбываюцца падчас распіцця спіртных напояў, пры заплыве ў нецвярозым стане, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Ужыванне алкаголю падчас адпачынку каля вады можа прывесці да трагедыі. Заўсёды ацэньвайце свае сілы, не плывіце на спрэчку, патлумачце дзецям, да чаго можа прывесці няправільны разлік сіл. Памятайце: смяротна небяспечна ныраць у воду з вышыні, дамбы і іншых збудаванняў. Нельга гэтага рабіць і ў невядомых месцах.

Дзеці — на адлегласці выцягнутай рукі

Здараліся на мінулым тыдні і гісторыі са шчаслівым канцом. Познім вечарам 12 чэрвеня ратавальнікам Віцебскага раёна паступіла паведамленне аб тым, што на возеры Гародна каля вёскі Сасноўка тоне чалавек. Калі на месца прыбылі найбліжэйшыя падраздзяленні МНС, пацярпелы, які трымаўся за прыстань, знаходзіўся на адлегласці каля паўметра ад берага. Маладыя людзі, якія разам з апошнім адпачывалі на пляжы, паведамілі, што 22-гадовы юнак даплыў да прыстані, а вярнуцца назад самастойна ўжо не можа.

Як расказаў **начальнік дзяжурнай змены Ігар КАРЖАНЕЎСКІ,** прыбыўшы на месца, супрацоўнікі МНС адразу спусцілі на ваду ратавальную дошку. «Падплыўшы разам з калегамі да хлопца, зразумелі, што малады чалавек — у паніцы, — успамінае той дзень ратавальнік. — Ён нам сказаў, што яго ногі схоплівае сутарга, таму плысці назад катэгарычна адмаўляўся. Угаварыўшы маладога чалавека надзець ратавальную камізэльку, мы пасадзілі яго на ратавальную дошку і даставілі на бераг. Там ужо чакала хуткая дапамога. Пасля агляду медыкаў хлопец ад шпіталізацыі адмовіўся». Як потым высветлілася, пацярпелым аказаўся жыхар Віцебска.

Падчас падобнай сітуацыі кожная хвіліна на вагу золата. І вельмі добра, калі побач з тым, то трапіў у бяду, аказваюцца неабыякавыя людзі. Такія як, напрыклад, мужчына, які днямі ў Чэрвеньскім раёне выцягнуў з вады дзяўчынку. Ён лавіў рыбу на вадаёме ў вёсцы Вялікаполле. Непадалёк купаўся мужчына і дзве дзяўчынкі. Раптам усе яны сталі тануць. Не раздумваючы, рыбак кінуўся на дапамогу і да прыбыцця ратавальнікаў выратаваў адну з дзяўчынак. Іншая выбралася з вады самастойна. Мужчына, які купаўся з дзецьмі, загінуў. Як потым высветлілася, ахвярай вады стаў дзядуля адной з дзяўчатак.

Вечарам таго ж дня ратавальнікі атрымалі паведамленне аб патанулым дзіцяці ў вадаёме ў аграгарадку Калодзішчы Мінскага раёна. Падлетак 2006 года нараджэння з двума братамі і сябрам адпачываў на беразе, затым вырашыў пакупацца. Раптоўна ён нырнуў у ваду, пасля чаго не з'явіўся на паверхні. Відавочцы спрабавалі знайсці хлопца, патэлефанавалі ратавальнікам. Без прыкмет жыцця падлетак быў знойдзены на адлегласці 20 метраў ад берага.

Як заўважае Анастасія Швайбовіч, менавіта падлеткі паводзяць сябе каля вады вельмі бестурботна, самаўпэўнена, бегаюць і скачуць, не адчуваючы пры гэтым ніякай небяспекі. «Бацькі павінны разумець, што, колькі б дзіцяці не было гадоў, няважна: дашкольнік гэта або навучэнец, — не варта знаходзіцца каля вады без нагляду дарослых, — падкрэслівае афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС. — Менавіта бацькі павінны пагаварыць з дзецьмі аб усім, што можа адбыцца, папярэдзіць іх аб небяспецы і патлумачыць наступствы. А для маленькага дзіцяці смяротнымі могуць стаць нават дэкаратыўныя сажалкі і ёмістасці з вадой».

Ратавальнікі папярэджваюць, што не варта забываць пра бяспеку і тады, калі вы адпраўляецеся на прагулку на лодцы, катары, катамаране або гідрацыкле. Падобнае «падарожжа» павінна адбывацца ў ратавальнай камізэльцы. Акрамя таго, нельга перавышаць устаноўленую колькасць людзей на борце, кіраваць плавальнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення, сядзець на бартах, пераходзіць з месца на месца і перасаджвацца на іншыя катары, лодкі. Таксама забараняецца выходзіць на ваду на плаўсродках, непрыстасаваных для гэтых мэт.

Нярэдка трагедыяй заканчваецца і знаходжанне на вадзе ў надзіманых прадметах. Асабліва гэта небяспечна для тых, хто не ўмее плаваць. Надзіманыя камеры, матрацы вельмі лёгкія, таму нават слабага ветру і цячэння дастаткова, каб аднесці іх на вялікія адлегласці. Варта расслабіцца на некалькі хвілін — і бераг акажацца па-за межамі дасягальнасці, а жыццё — пад пагрозай.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з адкрытых крыніц.

Каб пазбегнуць трагедыі, варта выконваць простыя правілы:

— купацца толькі ў спецыяльна адведзеных месцах, на абсталяваных пляжах, дзе ў выпадку няшчаснага выпадку можна разлічваць на дапамогу ратавальнікаў;

— не купацца ў стане алкагольнага ап'янення;

— не заплываць за буйкі і іншыя агароджы, устаноўленыя ў месцах для купання;

— не дапускаць сваволства на вадзе і не палохаць іншых;

— не падаваць ілжывых сігналаў бедства;

— не купацца аднаму ў вячэрні і начны часы;

— не пакідаць дзяцей без нагляду.

КАЛІ ВЫ БАЧЫЦЕ, ШТО НЕХТА ТОНЕ:

— паклічце на дапамогу іншых або супрацоўнікаў Таварыства ратавання на водах, калі яны ёсць побач;

— патэлефануйце ў МНС (на нумарах 101 або 112) і выклічце хуткую дапамогу (па тэлефоне 103);

— кіньце таму, хто тоне, ратавальны круг або доўгую вяроўку з вузлом на канцы (калі яны ёсць);

— калі ёсць лодка, падплывіце да чалавека і паспрабуйце дапамагчы;

— калі вы плаваеце добра і ўпэўнены ў сваіх сілах, паспрабуйце дабрацца да чалавека самастойна: абхапіце яго ззаду за плечы і паспрабуйце пазбегнуць спроб схапіцца за вас, якія ў паніцы будзе прадпрымаць той, хто тоне, — і плывіце з ім назад;

— калі чалавек знаходзіцца без прытомнасці, цягніце яго да берага, узяўшы рукой пад падбародак такім чынам, каб яго твар пастаянна знаходзіўся над паверхняй вады;

— да прыбыцця медыкаў па магчымасці прыступіце да аказання першай дапамогі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Вялікабрытанія пачала дэпартацыю нелегальных мігрантаў у Руанду

Першы самалёт з нелегальнымі мігрантамі вылецеў з Вялікабрытаніі ў Руанду. Пра гэта, паводле тэлеканала Sky News, паведаміла кіраўнік брытанскага МЗС Ліз Трас. Адпраўка мігрантаў самалётам абыдзецца брытанскай казне прыкладна $610 тыс. Трас заявіла, што падобныя рэйсы працягнуцца. Такія меры дапамогуць брытанскім уладам «зламаць бізнес-мадэль гандляроў людзьмі». Кіраўнік брытанскага МЗС таксама заявіла, што не згодная з выказваннем брытанскіх епіскапаў аб тым, што палітыка адпраўкі тых, хто мае патрэбу прытулку ў адзін канец ва Усходнюю Афрыку, ганьбіць Вялікабрытанію. Раней рашэнне дэпартаваць мігрантаў у Руанду таксама раскрытыкавалі ва УВКБ ААН. Там адзначылі, што Лондан спрабуе перакласці адказнасць за нелегальных мігрантаў на іншыя краіны. Характэрна, што яшчэ ў 2021 годзе Вялікабрытанія ўзнімала ў ААН пытанне аб парушэннях Руандай дэмакратычных прынцыпаў. У прыватнасці, Лондан заяўляў, што ў афрыканскай краіне парушаюцца правы чалавека і ўшчамляецца свабода СМІ. Аднак зараз брытанскія ўлады характарызуюць Руанду як адну з самых бяспечных дзяржаў у свеце.

У Швецыі, Даніі і Германіі рэкордная інфляцыя

У Швецыі ўстаноўлены 30-гадовы рэкорд па інфляцыі, паведамілаТАСС са спасылкай на Цэнтральнае статыстычнае бюро краіны. Паводле даных спецыялістаў, узровень інфляцыі ў гадавым выражэнні дасягнуў 7,2 працэнта, гэта найвышэйшы паказчык з 1991 года. Адзначаецца, што рост цэн закрануў перш за ўсё электраэнергію, паліва, прадукты харчавання і тавары лёгкай прамысловасці. Рэкордныя гадавыя значэнні інфляцыі ў 7,4 працэнта ўстаноўлены і ў Даніі. Галоўным чынам гэта звязана з адмовай краіны купляць у Расіі газ за рублі, што пацягнула за сабой павышэнне кошту электраэнергіі, паліва і прадуктаў. Б'е рэкорды інфляцыя і ў Германіі. Па выніках мая яна склала 7,9 працэнта ў гадавым выражэнні. Дадзенае значэнне інфляцыі стала рэкордам з 1970-х гадоў, калі цэны ў краіне ўзраслі з-за нафтавага крызісу.

На Еўропу насоўваецца экстрэмальная спякота

Сіноптыкі прагназуюць, што Еўропу ў найбліжэйшыя дні чакае небывалая спякота. Пра гэта паведаміў тэлеканал Euronews. У 32 правінцыях Іспаніі слупкі тэрмометра пакажуць экстрэмальныя тэмпературы, адзначыла дзяржаўная метэаслужба. Мацерыковая Іспанія і Балеарскія астравы будуць пакутаваць ад спякоты мінімум да 16 чэрвеня. Месцамі тэмпература падымецца да 43 градусаў Цэльсія, прагназуюць сіноптыкі. Такога ранняга наступлення спякоты Іспанія не памятае з 1981 года. Горача будзе і ў паўднёвай частцы Францыі. З 15 чэрвеня сіноптыкі чакаюць вельмі высокія тэмпературы на паўднёвым захадзе — 35-36 градусаў. Пры гэтым максімальна спякотнымі будуць дні з 16 да 18 чэрвеня.

Асцярогі экспертаў выклікае звязаная са спякотай засуха. Абмежаванні на выкарыстанне вады ўжо ўвялі 35 французскіх дэпартаментаў, каб спраўляцца з гарачай у поўным сэнсе гэтага слова сітуацыяй.

На крайнім Поўдні

АНТРАПАГЕННАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ НА АНТАРКТЫДУ

Інстытут прыродакарыстання НАН Беларусі валодае новымі данымі аб асаблівасцях прэсных вод астравоў у Антарктыцы.

Яны былі атрыманы загадчыкам лабараторыі трансгранічнага забруджвання, доктарам тэхнічных навук, прафесарам Сяргеем Какарэкам па выніках ландшафтна-геахімічных даследаванняў на астравах заліва Маргерыт (Заходняя Антарктыка), якія навуковец праводзіў падчас удзелу ў складзе 4-й турэцкай антарктычнай экспедыцыі ў лютым-сакавіку 2020 года.

Вынікі даследавання макра- і мікраэлементаў у снезе і прэснаводных вадаёмах даследаваных астравоў апублікаваны ў апошнім нумары навуковага часопіса Polar Science. Гэта першая публікацыя ў аўтарытэтным міжнародным выданні, прысвечаная гідрахіміі прэсных вод дадзеных астравоў. Даследаванні беларускага навукоўца на Антарктычным паўвостраве ўключалі вывучэнне вадаёмаў, вадацёкаў і снегу ў розных частках астравоў Дзісмал і Хорсшу для вывучэння іх мікраэлементнага і ізатопнага складу, апісанне ландшафтных асаблівасцяў мясцовасці, расліннасці і глеб. Асаблівая ўвага ўдзялялася паралельнаму адбору «свежага» і «старога» снегу для індыкацыі ўкладу рэгіянальных і лакальных прыродных і антрапагенных фактараў у яго элементны і ізатопны склад. Устаноўлена, у прыватнасці, што варыябельнасць і сярэднія канцэнтрацыі макра- і мікраэлементаў у «свежым» снезе значна вышэйшыя, чым у «старым». Усе тыпы водных проб маюць высокія адносныя канцэнтрацыі натрыю, што пацвярджае дамінаванне марскіх аэразоляў як крыніцы іх паступлення. А высокія каэфіцыенты ўзбагачэння прэсных вод цынкам, кадміем, селенам і сурмой сведчаць аб антрапагенным характары паступлення гэтых элементаў, пераважна з далёкім пераносам паветраных мас.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Добрая справа

«КОЖНЫ ХОЦЬ РАЗ У ЖЫЦЦІ МУСІЦЬ ЗДАЦЬ КРОЎ»

У Сусветны дзень донара крыві, 14 чэрвеня, міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч, міністр працы і сацабароны Ірына Касцевіч, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, дырэктар МНПЦ хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо, медыкі з розных устаноў аховы здароўя, прадстаўнікі Маладзёжнага савета пры Міністэрстве аховы здароўя здалі кроў у цэнтральным офісе Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Супрацоўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўжо тры гады запар удзельнічаюць у дабрачыннай акцыі, прымеркаванай да Сусветнага дня донара крыві.

Фота БелТА.

— За заклікамі стаць донарам хаваюцца не проста словы: пераліванне крыві і яе кампанентаў дазваляе штогод ратаваць мільёны чалавечых жыццяў у свеце. Для фарміравання дастатковых запасаў донарскай крыві неабходна прыцягваць большую колькасць грамадзян, гатовых добраахвотна і, што немалаважна, на бязвыплатнай аснове здаваць кроў, — адзначыла Ірына Касцевіч.

Генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый Шаўцоў звярнуў увагу на тое, што кожны чалавек хоць бы раз у жыцці мусіць здаць кароў:

— Я донар са студэнцкіх часоў. У Сусветны дзень донара таксама абавязкова буду здаваць кроў бязвыплатна. Чаму гэта трэба? Мы не ведаем, як складзецца сённяшні дзень, заўтрашняе наша жыццё. Магчыма, нам ці нашым блізкім, родным спатрэбіцца порцыя крыві, — адзначыў ён. — Бязвыплатнае донарства ў маім разуменні — гэта і чалавечнасць, і гуманнасць, і інтэлігентнасць, таму што чалавек тым самым ад чыстага сэрца ахвяруе часцінку сябе для выратавання іншага чалавека жыцця.

Паводле слоў дэпутата Палаты прадстаўнікоў старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алега Гайдукевіча, гэтая акцыя аб'ядноўвае многіх вядомых людзей, якія паказваюць прыклад іншым.

— А ўслед за намі пойдуць і іншыя людзі. Я лідар партыі і ведаю пра тое, што прыедуць члены партыі ЛДП. І так па іншых напрамках. Лідар у спорце, за ім — спартсмены, лідар на працы, за ім — яго работнікі. Мы павінны паказваць прыклад.

Алена КРАВЕЦ.

Цікавосткі ТІБА-2022

«РАЗУМНЫ ГОРАД», ЛІЧБАВЫ БАЛЬНІЧНЫ, ДАСЬЕ НА СПАРТСМЕНА...

І іншыя электронныя здабыткі беларусаў

Штучны інтэлект, электронная працоўная кніжка, 3D-тэхналогіі, лічбавая адукацыя, электронныя паслугі, вынаходніцтвы для бяспекі дома і зручнасці штодзённых спраў... За пяць дзён работы Міжнароднага форуму ТІБА наведвальнікі ўбачылі навінкі і даведаліся пра напрамкі развіцця і будаўніцтва лічбавай будучыні ў самых розных галінах. Што існуе і плануецца для лічбавай трансфармацыі ў жыцці беларусаў, паглядзела карэспандэнт «Звязды».

ЛІЧБАВАЯ СУВЯЗЬ І «РАЗУМНЫ ГОРАД»

Генеральны партнёр ТІБА сёлета — «Белтэлекам», які зладзіў на форуме маштабную выставу пад дэвізам «Белтэлекам — якасць жыцця». Аснова экспазіцыі — праекты «разумнага горада», стварэнне і развіццё якіх — адзін з ключавых напрамкаў лічбавай эканомікі. Каб пашыраць спектр сваіх сэрвісаў, кампанія плануе працаваць па мадэлі «віртуальнага аператара», расказаў **генеральны дырэктар «Белтэлекама» Юрый ПЕТРУЧЭНЯ**:

— Сёння арганізацыя эксплуатуе 150 тысяч кіламетраў валаконна-аптычных ліній сувязі. На створанай тэхналагічнай базе кампанія рэалізоўвае комплексныя інавацыйныя рашэнні, у тым ліку для «разумнага горада». Ужо рэалізаваны паслугі «разумны дом» і «відэакантроль».

Сувязісты гатовыя прапаноўваць не асобныя элементы «разумнага горада», а паўнавартаснае комплекснае лічбавае рашэнне па чатырох кірунках: «разумны дом», «бяспека», «тэлеметрыя» і «гарадская інфраструктура».

«Разумны дом» дазваляе стварыць індывідуальны сцэнарый камфортнага пражывання і зберажэння рэсурсаў, больш за 52 тысячы гаспадарак ужо карыстаюцца гэтай паслугай. «Відэакантроль» — таксама ўжо досыць шырока распаўсюджаная паслуга, якой карыстаюцца амаль 160 тысяч спажыўцоў. На базе гэтай паслугі рэалізаваны контур бяспекі, а модуль відэааналітыкі дазволіць укараніць такія функцыі, як распазнаванне твараў і нумароў, падлік наведвальнікаў з дапамогай прылад «разумны шлагбаум», «разумная прахадная», «разумны дамафон», удакладніў Юрый Петручэня.

Пілотны праект па тэлеметрыі для ўліку спажывання камунальных рэсурсаў рэалізаваны ў Оршы. Дзякуючы контуру «гарадская інфраструктура» можна рэалізаваць праекты па кантролі напаўняльнасці смеццевых бакаў, адкрыцця і закрыцця люкаў, аўтаматызацыі асвятлення, датчыкаў паркоўкі і іншае.

ПРАЦОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ХВАРОБА

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва працуе над стварэннем галіновай лічбавай платформы сацыяльна-працоўнай сферы, якая будзе выступаць агрэгатарам камунікацыйных сістэм і фактычна мець аналітычны блок, каб рэалізоўваць комплексны прынцып аказання падтрымкі чалавеку, расказаў **Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны**:

— У сучасным свеце немагчыма абысціся без інфармацыйных тэхналогій, таму пад кожную з гэтых задач Мінпрацы створаны свае спецыфічныя сістэмы. Усё ўзаемадзеянне паміж сістэмамі адбываецца праз AAIC, да якой падключана каля 1000 спажыўцоў і штогод аказваецца каля 2 мільёнаў паслуг па 26 працэдурах, а сёлета іх з'явіцца яшчэ шэсць. Застануцца комплексныя працэдуры, выкананне якіх залежыць ад удзелу іншых органаў.

Індывідуальны персаніфікаваны ўлік застрахаваных асоб — інфармацыйны рэсурс, які ўлічвае ўсе перыяды працоўнай дзейнасці, калі ўзносы за работніка плацію наймальнік ці сама асоба, а таксама сумы заробку, з якога выплачваліся страхавыя ўзносы.

— Пачынаючы з 2003 года працягласць працоўнага стажу і заробку для прызначэння пенсіі адбываецца толькі па гэтай праграме. Пакрысе такая інфармацыя пашыраецца — дадаюцца звесткі не толькі пра тое, калі працаваў чалавек, але і кім, які від працоўнага дагавора заключаны, прычыны звальнення. Такім чынам мы плануем стварэнне своеасаблівай электроннай працоўнай кніжкі, хоць заканадаўча яе статус не замацаваны. А адна з мэт — перайсці на электронны ўлік працоўнага стажу, у тым ліку нестрахавых перыядаў: навучанне, служба ў арміі і іншае. Калі гэта пройдзе на заканадаўчым узроўні, працоўная дзейнасць грамадзян будзе лічбавана да 1990 года, каб з часам працягласць працоўнага стажу для прызначэння працоўнай пенсіі было аўтаматызавана, — удакладніў намеснік міністра.

Сумесна з Міністэрствам аховы здароўя распрацоўваецца электронны ліст непрацаздольнасці. Сёння дапамогу па часовай непрацаздольнасці выплачваюць наймальнікі, аднак за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання. Каб выключыць удзел работніка ў гэтым працэсе, а наймальніка вызваліць ад выплат, плануецца, што ліст непрацаздольнасці будзе запаўняцца ў электронным выглядзе, паведамленне пра гэта — накіроўвацца наймальніку, а з часам — і ў фонд сацыяльнай абароны, дзе на падставе звестак аб даходзе чалавека будзе разлічаны сярэдні дзённы заробак, нават калі асоба працуе ў некалькіх наймальнікаў. І чалавеку не трэба будзе збіраць выплаты па ўсіх месцах работы, ён будзе атрымліваць толькі адну дапамогу ў той жа суме.

— Распрацоўваецца і пытанне аказання дзяржпадтрымкі ў практыўным фармаце, калі мы зможам аналізаваць асобныя жыццёвыя сітуацыі. Пакуль гэта датычыцца пенсій па інваліднасці і сацыяльных пенсій, якія будуць пералічвацца дзецям-інвалідам на пошту ці ў банк, і чалавеку не трэба будзе звяртацца ў Мінпрацы, — дадаў Валерый Кавалькоў.

ТРАНСПАРТ І РАЧНАЯ СІСТЭМА

Летась была прынятая і стратэгія лічбавай трансфармацыі транспартнай дзейнасці да 2025 года, з улікам якой вызначаны тры асноўныя кірункі. Гэта стварэнне адзінай інфармацыйнай платформы транспартнай дзейнасці, якая будзе выступаць даверанай інфармацыйным асяроддзем для абмену інфармацыяй паміж усімі ўдзельнікамі гэтай сферы і дзяржорганамі. Планамі па далейшай лічбавізацыі аб'ектаў транспартнай інфраструктуры, развіцці навуковых даследаванняў, скіраваных на лічбавыя тэхналогіі, і падрыхтоўцы кадраў падзяліўся **Сяргей ДУБІНА, намеснік міністра транспарту і камунікацый**:

— У рамках галіны плануецца стварэнне адзінага інфармацыйна-аналітычнага сэрвісна-арыентаванага асяроддзя транспартнага комплексу, які будзе ўяўляць сабой сукупнасць узаемазвязаных лічбавых платформ, аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм, рэсурсаў і адпаведнай інфраструктуры. Асноўная крыніца фарміравання лічбавай інфраструктуры — даныя аэраздымак, выкананыя беспілотнікамі.

Прапрацоўваецца стварэнне рачной інфармацыйнай сістэмы, эфект ад якой дасягаецца за кошт збору ўсёй неабходнай інфармацыі аб суднах і водных шляхах у рэжыме рэальнага часу. У рамках гэтай сістэмы запланаваны пілотны праект акваторыі і калькулятар кошту рачных перавозак, які дапаможа патэнцыйным заказчыкам загадзя пралічыць кошт транспарціроўкі грузаў у межах краіны і за мяжой.

Прынята рашэнне аб распрацоўцы інтэграцыйнага модуля для рэалізацыі саюзнай праграмы на базе Аўтаматызаванай сістэмы ўліку і выдачы дазволаў на праезд перавозчыкаў Беларусі па тэрыторыі іншаземных дзяржаў — AIC «Дазвол». Гэта асноўны праграмны прадукт, які выкарыстоўвае транспартная інспекцыя. У перспектыве на базе AIC «Дазвол» мяркуецца стварэнне адзінай лічбавай платформы транспартнай інспекцыі.

СПОРТ І КАРТАГРАФІЧНЫЯ СЭРВІСЫ

Мінспорту сумесна з Мінадукацыі, Белдзяржуніверсітэтам фізкультуры і БНТУ стварылі навукова-адукацыйны кластар па інтэлектуальных тэхналогіях у спорце для ўкаранення ў практыку спорту навуковых распрацовак, заснаваных на найноўшых тэхналогіях, расказаў **Руслан ВАРАНКОЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення планавання і арганізацыйнай работы Мінспорту і турызму**:

— За 2020—2021 гады ў кластары прайшло больш як 200 тэсціраванняў спартсменаў па 18 відах спорту. Наступны кірунак дзейнасці па інфарматызацыі галіны — работа рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту, які сёлета ўкараніў аўтаматызаваную інфармацыйна-аналітычную сістэму «Электронная картка спартсмена», што дазваляе весці дасье на асобу: запаўняць пашпартна-дэмаграфічныя даныя і анамнез.

Сістэма дазваляе стварыць індывідуальны профіль спартсмена: ацэньваць яго якасці па сіле, вынослівасці, бачыць узровень падрыхтаванасці, выпрацоўваць рэкамендацыі трэнеру па карэкціроўцы мадэлі падрыхтоўкі і харчавання спартсмена па днях тыдня і з улікам яго ўзросту і індывідуальных асаблівасцяў.

Прадугледжана і стварэнне саюзнай праграмы — лічбавай платформы дыягностыкі спартыўна адораных дзяцей па інтэграваных паказчыках узаемадзеяння, што дазволіць атрымаць рэкардсмена, спадзяюцца ў Мінспорту.

Сумесна з нацыянальным кадастравым агенцтвам рэалізавана праграма ўкаранення тэматычнага слою «Беларусь спартыўная» на публічную кадастравую карту Беларусі. Зараз на карту нанесена інфармацыя пра 500 аб'ектаў.

Картаграфічныя сэрвісы створаны і ў Мінгарвыканкаме. Гэта, прынамсі, экалагічная карта горада, якая вядзе інвентарызацыю па адходах, складае маршруты, паказвае інтэрактыўныя кропкі на карце. Каб разумець, за кім замацаваны пэўныя тэрыторыі і аб'екты, быў створаны картаграфічны сэрвіс інтэрактыўнага замацавання тэрыторый. Гэты прадукт ёсць ужо ў Мінску, Гродне, а ў планах — маштабаванне на ўсю краіну.

Расказаць пра ўсе лічбавыя дасягненні ў рамках аднаго артыкула проста немагчыма — застаецца сачыць за навінамі і спрабаваць лічбу на ўласным вопыце.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

У МАБІЛЬНІКУ НЕЛЬГА ЗНАЙСЦІ АДКАЗЫ НА ЗАДАННІ ЦТ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт — адзін з 37 пунктаў правядзення ЦТ па беларускай мове. Учора ў васьмі яго аўдыторыях павінны былі пісаць тэст 297 абітурыентаў. У 10 гадзін раніцы іх пачалі запускаць у хол. На ўваходзе ўсе праходзяць строгі фэйс-кантроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». З ксеракопіяй пашпарта абітурыентаў не прапусцяць, як і з вадзіцельскім пасведчаннем.

Усе арганізацыйныя моманты ў БДМУ добра прадуманы, таму чарга на ўваходзе хутка растварэцца. Усім прапануюць здаць лішнія рэчы, у тым ліку мабільныя тэлефоны і «разумныя гадзіннікі», у камеру захоўвання, ролю якой выконвае гардэроб. З сабой у аўдыторыю можна ўзяць толькі пашпарт, пропуск і чорныя гелевыя ручкі. Дазваляецца таксама прыхапіць пітную ваду. Заблытацца ў калідорах медуніверсітэта немагчыма. Уся лагістыка добра прадуманая, паўсюль размешчаны паказальнікі-падказкі. На лесвіцах па дарозе ў экзаменацыйныя аўдыторыі ўсіх чакае яшчэ адзін пашпартны кантроль. У 10.30 большасць абітурыентаў ужо занялі свае месцы.

Нягледзячы на тое, што каранавірус адступіў, ранейшыя патрабаванні да рассадкі абітурыентаў захоўваюцца — гэта адлегласць паміж удзельнікамі тэсціравання ў метр, абмежаванні па колькасці людзей у аўдыторыі. А вось наяўнасць медыцынскай маскі цяпер неабавязковая, хоць усіх ахвотных універсітэт гатовы быў забяспечыць гэтым ужо звыклым для ўсіх «аксесуарам».

У 10.30 на вачах у журналістаў арганізацыйная камісія разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржкантролю адчыніла сейф, куды трыма гадзінамі раней былі змешчаны матэрыялы цэнтралізаванага тэсціравання. Іх дастаўкай па ўсёй краіне займаюцца кур'еры фельд'егерскай службы. Матэрыялы ЦТ прывозяцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх. Для разносак тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, рыхтуюцца

спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма распячатаць непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да памяшканняў. На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж і арганізатары ЦТ пацвярджаюць сваімі подпісамі, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі.

Калі самаадчуванне рэзка пагоршыцца падчас экзамену, гэты факт абавязкова павінен засведчыць медыцынскі работнік.

Да прыёмнай кампаніі сёлета прыцягнута па краіне больш як 200 супрацоўнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія павінны адсочваць усе яе ключавыя моманты: ад правядзення тэставых выпрабаванняў да падачы дакументаў у прыёмныя камісіі і залічэння. Іх «вахта» закончыцца толькі пасля завяршэння залічэння ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Супрацоўнікі камітэта па ўсёй краіне дапамагаюць забяспечваць захаванасць пакетаў з тэставымі заданнямі і бланкаў адказаў. У іх суправаджэнні ажыццяўляецца транспарціроўка сумак з Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў у пункты правядзення тэсціравання. Разам з імі прадстаўнікі арганізацыйных камісій па ўсёй краіне адчынялі ўчора апячатаныя сейфы, дзе захоўваліся пакеты з «каштоўнымі паперамі».

Намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, намеснік старшыні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў Андрэй ЛАБОВІЧ заўважыў, што заўваг і парушэнняў у ходзе цэнтралізаванага тэсціравання з году ў год выяўляецца ўсё менш. Летась было зарэгістравана толькі 11 выпадкаў парушэнняў на ЦТ, з іх у васьмі выпадках абітурыенты праігнаравалі прапанову здаць свае мабільнікі, за што і расплаціліся адхіленнем ад ЦТ.

«Кантроль за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ажыццяўляецца дзяржаўнай камісіяй, перад якой стаіць задача забяспечыць абітурыентам роўныя магчымасці пры паступленні, а таксама выкананне заканадаўства арганізацыйнымі і прыёмнымі камісіямі, — падкрэсліў Андрэй Лабовіч. — Як мы пераканаліся, у БДМУ ўсё зроблена ў рамках дзейнага заканадаўства: забяспечаны належны прапускны рэжым, добра падрыхтаваны аўдыторыі, ва ўсіх памяшканнях ёсць гадзіннікі, якія дазваляюць сачыць за часам выканання тэста, і пітная вада».

— У апошнія гады мы насамрэч рэгіструем толькі адзінкавыя выпадкі, калі парушаюцца правілы здачы ЦТ, у адрозненне ад 2003—2008 гадоў, калі гэта форма прыёмнай кампаніі яшчэ толькі ўкаранялася, — пацвярджае **адказны сакратар камісіі па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання на базе БДМУ Дзмітрый ДАНІЛАЎ.** — Наш універсітэт адным з першых у краіне далучыўся да правядзення ЦТ, і многія працэдурныя моманты, прапісаныя сёння ў дакументах, калісьці прапаноўваліся і апрабоўваліся менавіта ў нашых сценах. Мы, напрыклад, прапанавалі праводзіць лёсаванне арганізатараў і адказных у аўдыторыях. Ніхто з іх загадзя не ведае, у якой аўдыторыі апынецца, што не дапускае злоўжыванняў.

Карыстаючыся выпадкам, хацелася б звярнуцца да абітурыентаў: паверце, што ў мабільным тэлефоне нельга знайсці падказкі і адказы на заданні ЦТ, да таго ж ніхто не дасць вам гэта зрабіць, таму не варта праносіць іх з сабой у аўдыторыі. Вы можаце перакрэсліць магчымасць паступіць у ВНУ сама меней на год. Ды ці трэба выпрабоўваць лёс.

Дзмітрый Данілаў заўважыў, што ў медуніверсітэце фактычна кожны можа аказаць абітурыенту першую дапамогу, але з улікам патрабаванняў да правядзення ЦТ у час экзамену тут працуе медыцынскі пункт, дзе дзяжураць два клінічныя ардынатары з кафедры кардыялогіі. Страта прытомнасці ад спёкі, нізкі ціск — найбольш верагодныя прычыны звароту да медыкаў.

Абітурыентам карысна ведаць: у тым выпадку, калі самаадчуванне рэзка пагоршыцца падчас экзамену, гэты факт абавязкова павінен засведчыць медыцынскі работнік. З медыцынскай даведкай будзе дадзена магчымасць пераздаць гэту дысцыпліну ў рэзервовы дзень. Падоўжыць тэрмін выканання тэставай работы арганізатары, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, не маюць права. Але здараюцца сітуацыі, калі пасля кансультацыі медыкаў абітурыент вяртаецца ў аўдыторыю і працягвае здаваць экзамен. А праз пару дзён заяўляе, што адчуваў сябе дрэнна, таму не змог належным чынам сканцэнтравацца. Просіць дапусціць яго да пераздачы экзамену ў рэзервовы дзень. Пасля таго як на пропуску з'яўляецца адзнака «тэсціраванне прайшоў», зрабіць гэта ўжо немагчыма. Таму варта адразу аб'ектыўна ацэньваць свой стан (асабліва з улікам спякоты). Усё трэба рабіць своечасова.

Дарэчы, для аператыўнага рэагавання і разгляду зваротаў грамадзян па пытаннях, звязаных з правядзеннем уступных іспытаў, на базе Камітэта дзяржкантролю і абласных камітэтаў дзяржкантролю арганізавана работа тэлефонаў гарачай лініі. Інфармацыя аб кантактных тэлефонах размешчана на сайце КДК.

«Падчас цяперашняй уступнай кампаніі паступіла тры звароты па пытанні прапушчаных тэрмінаў рэгістрацыі на ЦТ. У двух выпадках звароты былі задаволены, бо рэгістрацыя на ЦТ была прапушчана па аб'ектыўных прычынах», — расказаў Андрэй Лабовіч.

У 10.40 пакеты з бланкамі адказаў і тэставымі заданнямі дастаўляюцца ў экзаменацыйныя аўдыторыі. Градус напружання расце. Абітурыентам даюць апошнія кансультацыі: як запаўняць вобласць рэгістрацыі, што рабіць, калі скончыцца папера для чарнавіка, што будзе за нецэнзурныя словы ў бланку адказаў... Тлумачаць, што датэрміновая здача экзаменацыйных матэрыялаў спыняецца за 15 хвілін да завяршэння часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста. Адказны арганізатар інфармуе абітурыентаў за 15 і 5 хвілін аб заканчэнні часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста. Удзельнікам ЦТ забараняецца мяняцца месцамі, выкарыстоўваць чужую дапамогу пры выкананні тэставых заданняў, размаўляць з іншымі ўдзельнікамі ЦТ, карыстацца любымі сродкамі сувязі. Абітурыент, які парушыў патрабаванні, адхіляецца ад удзелу ў ЦТ. Яго бланк адказаў пагашаецца, а ў пропуску робіцца пазнака «Выдалены за парушэнні». У 11.00 распячатваецца пакет з бланкамі адказаў, а затым — і з тэставымі заданнямі. Пасля распячатвання пакета з педагагічнымі тэстамі абітурыенты ў аўдыторыю ўжо не дапускаюцца. Адлік часу пайшоў...

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

«Гарачы тэлефон» рабочай групы дзяржаўнай камісіі (Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь) +375 17 327 66 80, e-mail: goskomisia@mail.ru

ПАМЯЦІ ЛЕГЕНДАРНАГА ЭКСЛІБРЫСІСТА

13 чэрвеня памёр Алег Аляксандравіч Судлянкоў, вядомы ў Беларусі і за яе межамі калекцыянер графікі, кніжных знакаў

Ужо і не ўсе ведаюць, што гэта за слова такое — экслібрыс, не ведаюць, што экслібрыс і ёсць кніжны знак. А людзі, якія альбо выраблялі яго альбо калекцыянуюць, — самыя сапраўдныя экслібрысісты. Па адукацыі інжынер (закончыў два політэхнічныя інстытуты — у Мінску і ў Ташкенце), Алег Судлянкоў пачаў збіраць экслібрысы з 1966 года. Улюбёнасць у графічныя выявы, якія раскрывалі інтарэсы, зацікаўленні розных уладальнікаў бібліятэк, прыцягвалі яго магнетычна, дапамагалі спасцігаць таямніцы кнігазбіральніцтва.

Як калекцыянер наш зямляк (нарадзіўся Алег Аляксандравіч 8 мая 1940 года ў Хабараўску, вучыўся ў сярэдняй школе ў Прыбалтыцы; але большая частка яго жыцця звязана з Беларуссю, Мінскам) не імкнуўся да колькасных параметраў сваіх зборыў. Сабраўшы некалькі тысяч кніжных знакаў, Алег Аляксандравіч выбіраў цікавых яму мастакоў, стараўся ўключаць у свой збор тыя кніжныя знакі, якія былі нечым адметныя, якія ўжо самі па сабе мелі ўласную «біяграфію».

Ён рос і развіваўся разам з калекцыяй, сваімі знаходкамі дзяліўся праз выстаўкі, шмат пісаў пра экслібрыс у

Фота Яўгена ГРЫСЕЦКАГА.

перыядычным друку. На памяці — мноства яго інтэрв'ю (у газетах «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда», «7 дней» і іншых), а таксама аўтарскія публікацыі ў часопісах «Нёман», «Мастацтва», іншых выданнях. Прыкметна вылучаўся Алег Судлянкоў і як арганізатар, удзельнік выставачных праектаў. Калі ён сам не мог удзельнічаць у той ці іншай выстаўцы экслібрысаў, то з ахвотай перадаваў для экспазіцыі кніжныя знакі са сваёй калекцыі.

Ён з любоўю, захоплена падтрымліваў майстроў экслібрыса. Арганізаваў выданне ў Кіеве некалькіх кніг беларускіх кніжных графікаў — Генадзя Вяля, Рамана Сустава, Юрыя Якавенкі. Дапамог мінскаму выдаўцу Але Зміёвай выдаць серыю альбомаў, прысвечаных творчасці такіх экслібрысістаў, як Ганна Ціханава, Арлен Кашкурэвіч, Мікола Селяшчук, Юрый Якавенка, Генадзь Вяль. Алег Аляксандравіч сустракаўся, быў добра знаёмы з такімі легендамі і стваральнікамі кніжнага знака, і яго калекцыяніраванне, як Сяргей Фарцінскі, Лембіт Лыхмус, Якаў Бердзічэўскі, Алег Ласунскі, Валерый Палікарпаў, Генадзь Вяль, Фёдар Шурмялёў...

З сыходам з жыцця такога славутага, багатага на ідэі кніжніка, як Алег Аляксандравіч Судлянкоў, быццам памянела святла ў беларускім кніжніцтве. Пасля калекцыянера засталася кніга — «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў XVI — XX стст.». Яна зусім нядаўна выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», але ўжо стала вядомай на постсавецкай прасторы, пра кнігу пісалі ў самых розных выданнях.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

«МОЙ ТАТА ЗДРАДНІКАМ НЕ БЫЎ»

Падчас апошняй вайны нагараваліся, нацярпеліся ўсе: у кожнай сям'і свае страты і боль, свае перамогі і паражэнні. Наша не выключэнне.

...Вёска Слабада Ганаполле, што на ўскраіне Чачэрска, тады гудзела. Днём на вуліцах, вечарамі ў нямногіх ацалелых хатах абмяркоўвалася адна навіна: «Замялі Грышку Кудлу. Дастукаўся, нямецкі паслугач! Пакорміць блох у кутузцы».

Там жа гучалі зусім іншыя галасы: «Ды не здраднік ён! Памылка нейкая выйшла».

Гаварылі так пра нашага бацьку Рыгора Андрэевіча Пернікава. А Грышка Кудла — гэта яго мянушка. Іх у вёсцы амаль усе насілі: Сініцыны былі Касмачамі, Рыкуновы — Перчыкамі, Дзяржаўскія — Пылькамі... Да нас жа, Пернікавых, за пышныя косы-чупрыны, як бацька расказваў, спакон веку, прыліпла вось гэтае — Кудлы.

Размовы пра арышт аднаго з іх даляталіі, вядома ж, і да нас. Усё сямейства жыло ў пастаянным страху за бацьку, якому па тых часах і ў лепшым выпадку магла «свяціць» доўгая ссылка некуды ў Сібір, а ў горшым... «Быць не можа: там разбяруцца. Праўда пераможа, — хаваючы слёзы, абнадзейвала нас, пяцярых дзяцей, мама Таццяна Кірылаўна. — Ваш бацька здраднікам не быў. Плявузгаюць людзі... Бо нічога не ведаюць».

Да вайны Рыгор Андрэевіч (за плячыма — царкоўна-прыходская школа) працаваў загадчыкам складоў раённай канторы па нарыхтоўцы збожжа. У 41-м яго ў ваенкамаце пастрыглі, але на фронт не адправілі — далі зброю і каня з калёсамі, даручылі рыхтаваць калгасы для здачы збожжа дзяржаве.

Ён выканаў гэта даручэнне, але райцэнтр ужо занялі ворагі. Паромная пераправа цераз рэчку ў Чырвоным Беразе была разгромлена. Дадому бацька адправіўся праз Залессе, дзе месцічы якраз разносілі краму: не пакідаць жа добра чужынцам!

Татаў кум Сямён Гарбачоў разжыўся тады скрыняй віна — мужчыны пачаставаліся, у надзейнае месца схавалі вінтоўку, і бацька, весела падганяючы буланага, паехаў дамоў...

Стрэлы наперадзе прагучалі як гром... Ад нечаканасці і страху бацька ўміг працверазеў. На шляху ў яго быў шлагбаум і мардасты вартавы.

— Партызан! Хэндэ хох! — наставіўшы аўтамат, гаркнуў ён.

— Не... Не партызан, — стаў бажыцца бацька.

Паклікалі Раманьку, які жыў на нашай вуліцы. Той пацвердзіў бацькавы словы, і яго адпусцілі, але ж назаўтра загадалі з'явіцца ў камендатуру.

Там ад новых улад новае распараджэнне: прымаць збожжа з гаспадарак раёна. Адмовішся — будзе капут і табе, і тваёй сям'і.

Слоў на вецер немцы не кідалі.

Каб «выплыць», выбрацца з гэтага нерата, бацька таемна перапраўіў сям'ю (сваю і браташву) у Буда-Кашалёўскі раён, думаў, як збегчы туды самому, бо немцам служыць не збіраўся...

Якраз у гэты час да яго з'явіўся сувязны з партызанскага атрада, разам яны прадумалі схему дастаўкі хлеба для народных мсціўцаў, і некалькі такіх аперацый ужо правялі...

Падчас чарговай завязалася перастрэлка з фашыстамі. Партызаны з хлебам паспелі ўцячы, бацька таксама за ноч дабег да сям'і.

Немцы спалілі нашу хату, шукалі яго, але не знайшлі.

...Пасля вызвалення раёна тата ваяваў на Бранскім фронце, быў паранены, а пасля шпіталя арыштаваны. Уратавала яго толькі тое, што камісар партызанскага атрада Павел Дзедзік, які ў складзе дзеючай арміі ваяваў на тэрыторыі Польшчы, даслаў у Чачэрск ліст, у якім пацвердзіў, каму на самай справе служыў Рыгор Андрэевіч Пернікаў.

Так былі адноўлены і праўда, і добрае імя.

Уладзімір Пернікаў,
г. Гомель.

Рэзананс

«Не прадаецца хата бацькоў»?

Яшчэ і як прадаецца!

...Час ад часу думаю, як добра, што ў маёй газеце «Звязда» ёсць старонка для зваротнай сувязі. Чытаеш там, «Што людзі пішуць», і самой — амаль як на споведзі — хочацца расказаць аб набалелым і пры гэтым ведаць, што цябе не проста паслухаць, а яшчэ і зразумеюць.

Вось і на гэты раз: сяджу пад адцвіўшай антонаўкай, слухаю птушак і думаю: «Божухна, як жа хораша тут, як лёгенька дыхаць! І як жа добра, што ёсць у мяне гэтыя колькі сотак зямлі, а на іх — і сад, і город, і бацькоўскі дом.

Падумала так, парадавалася, разгарнула нумар «Звязды» — чытаю загаловак «Не прадаецца хата бацькоў» (нумар за 22.05. г. г.). Піша Надзея Дрындрожык. Значыць, не адну мяне хвалюе гэтая тэма?

...Як зараз помню: пяцьдзясят з невялікім гадоў таму, калі не стала нашага таты (ён рана памёр, дом дабудаваць не паспеў), у нас была магчымасць пераехаць у горад. Там жылі нашы любімыя цётачка і бабуля. «Там, побач з роднымі, нам будзе лягчэй», — казала матуля. А я нават слухаць яе не магла, не магла ўявіць, як можна прадаць сваю хату, любімую кароўку ды іншую жыўнасць, як можна здрадзіць — пакінуць сваю вёску, школу, сяброў?

Сястрычка была малая: дзе жыць, ёй было ўсё роўна. А я тады, помню, сказала як адрэзала, што з дому нікуды не паеду — буду жыць тут, нават адна.

Мы з мамай увесь вечар тады праплакалі, бо ёй, мусіць, таксама цяжка было расставацца з усім нажытым... І ўрэшце нікуды не паехалі — ні тады, ні пазней, калі мы з сястрой падрасліі і скончылі школу. Нас нібы магнітам прыцягвала родная хата, а найперш — мама, бо яна была адна, бо ёй цяжка. Да таго ж разам з гадамі ў яе стала прыбаўляцца хвароб. Яна досыць часта і падоўгу ляжала ў бальніцах, перанесла некалькі аперацый... І толькі дзякуючы богу ды нашым малітвам вярталася да жыцця.

...Вось і тым разам баяцца, як здавалася, ужо няма чаго: мама паправіцца, устане з пасцелі. Але ж пакуль што, ляжачы, яна раптам спытала: «А хто будзе жыць у гэтай хаце, калі я памру?» — «Я!» — адказала тут жа.

Не ведаю, ці парадаваў маму гэты адказ (болей пра хату размоў не было ды і быць не магло, бо праз тыдзень мамы не стала)...

А вось я каторы гадок, што называецца, трымаю слова: як ні цяжка і было, і ёсць, жыву ў бацькоўскай хаце, разам з ёю стараю і міжволі ўсё часцей паўтараю маміна пытанне: «Што ж далей? Хто будзе жыць у гэтай хаце — потым, пасля мяне?»

Для адказу, як моладзь гаворыць, уключаю логіку: з чатырох матуліных унукаў толькі адзін мой сын жыве ў сельскай мясцовасці і нікуды з'язджаць не збіраецца. (Гэта яго клопатам цепліцца жыццё ў роднай хаце, бо што б я адна зрабіла?)

У мяне таксама чацвёра ўнукаў. І зноў жа толькі ў аднаго, як здаецца, ёсць гены селяніна і гаспадара. Але ж яму цяпер восем гадкоў: аднаму Богу вядома, куды яго закіне ў васямнаццаць?!

Дзеці сястры — дакладна ведаю — сюды не паедуць. Значыць, што — прададуць наш дом, грошы неяк падзеляць і патрацяць (было б там што?). А нам, ранейшым гаспадарам, застанецца хіба што памарыць, каб пасялілася тут нейкая добрая сям'я, каб шанавала... Але ж ці захоча яна, ці зможа?

Для мяне гэта вельмі балючыя пытанні! А вось для іншых...

Шукаючы лепшага, лягчэйшага жыцця, асобныя з людзей, як я пагляджу, неяк проста расстаюцца з мінулым: збываюць бацькоўскія хаты, вырываюць свае карані — спрабуюць пусціць недзе новыя — хто на лецішчы, хто ў іншых гарадах, а то і краінах...

Няпростая гэта справа і нават небяспечная: выракацца свайго — мовы, культуры, малой радзімы. Хто мы без іх? Беларусы? Ці так — перакаці-поле?

Т. Новак,
Клецкі раён.

Весткі з месцаў

ХТО ДОБРА ПРАЦУЕ, ТАМУ І ШАНЦУЕ

У нашым аграгарадку Райца з размахам прайшло новае свята — свята малака.

Да яго напярэдадні былі падрыхтаваны павільёны з гатовай прадукцыяй, фотазоны, акваграм, цір, дзіцячы гарадок і нават жывая каза, якая згадзілася прыняць удзел у майстар-класе па даенні.

— У мяне дзве козачкі Мілка і Роза. Кожная з іх дае па чатыры літры малака ў дзень, — дзеліцца гаспадыня Таіса Захарчук. — Першая да таго ж вельмі спакойная: нікога ніколі не пакрыўдзіць. Так што яе можна пагладзіць, павучыцца даіць.

І, вядома ж, паспытаць малочных страў.

— Калі ласка, да нас на дэгустацыю, — запрашае **намеснік старшыні СВК «Свіцязянка-2003» Алена КВАСУЦЬ**, прапануючы сыры і сыркі ад мясцовых «Малочных дароў», выпечку са сталовай сваёй гаспадаркі. — Бачыце, на святочным торце выява рагулі і лічба 10 475 — столькі літраў малака надоена летась з кожнай каровы...

Але ж, як той казаў, не хлебам адзіным... Усе ахвотныя на свяце маглі паўдзельнічаць у конкурсах на веданне малочных страў і прадуктаў, найхутчэйшае збіванне масла, выпіванне малака.

— Свята сабрала столькі народу, і кожны знайшоў занятак па душы, — прызнаў адзін з гасцей Мікалай Васілеўскі. — Я вось удосталь натанцаваўся, паслухаў любімыя песні, збіў масла... Так што на дзень малака буду прыязджаць у Райцу заўсёды.

— Наша гаспадарка бярэ актыўны ўдзел у забеспячэнні краіны якаснай прадукцыяй, — зазначыў **старшыня СВК «Свіцязянка-2003» Аляксандр МЯЦЕЛІЦА**. — Каля 70 % даходаў дае малако. Надоі сёлета плануем падняць да 10 700 літраў. Мы вельмі рады сённяшняму святу. Калектывы многіх ферм і асобныя з яго ўдзельнікаў былі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Свята ўдалося на славу! Хочацца верыць, што яно стане традыцыйным.

Наталля Сакалянская,
фота аўтара.
г. Карэлічы.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

15 чэрвеня 2022 г. № 22 (658)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота БелТА.

КАБ УЛАДЗЕ ДАВЯРАЛІ, ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ

Мінулы тыдзень быў прысвечаны актуалізацыі метадаў і форм работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні. Адпаведны рэспубліканскі семінар-нарада прайшоў у Мінску. Актуальныя пытанні ўзаемадзеяння народа і дзяржавы абмеркавалі на шасці тэматычных секцыях. Удзельнікі семінара разгледзелі ўсе аспекты работы з насельніцтвам ад прынцыпу «адно акно» да выкарыстання новых медыя. Каб не быць галаслоўнымі, удзельнікі семінара пазнаёміліся з работай цэнтра інфармацыйных тэхналогій Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, міжнароднага цэнтра «Белтэлекам», тэрытарыяльных органаў мясцовага самакіравання, шэрагу адміністрацый Мінска, кантакт-цэнтра 115, ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь», маладзёжных валанцёрскіх цэнтраў. Аднак самае галоўнае — жывы абмен вопытам і пошук новых ідэй.

Работа з насельніцтвам і пошукі варыянтаў яе ўдасканалення — прыярытэт у дзейнасці дэпутацкага корпуса. Пра гэта неаднаразова казала і Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Семінар-нарада даў сенатарам магчымасць выслухаць, што хвалюе ўлады на месцах, і разам знайсці рашэнне некаторых праблем. «Сельскія Саветы працуюць агідна. Нам трэба ўзяцца за гэту тэму, прытым грунтоўна. Трэба перадаць Качанавай, каб яна занялася мясцовым так званым самакіраваннем. Я гэта да таго, што не забывайцеся, што галоўная апора ў вас — кіраўнікі гаспадарак. Усё засяроджана — матэрыяльныя рэсурсы — у іх руках. І людзі ідуць першым чынам да іх. Таму трэба на больш высокі ўзровень узнімаць дзейнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў: сельскай гаспадаркі, гандлю, абслугоўвання і прамысловых прадпрыемстваў, калі яны на тэрыторыі раёна ёсць», — падкрэсліваў Аляксандр Лукашэнка ў маі. Пасля такога даручэння Прэзідэнта актуальнасць семінара, прысвечанага рабоце з людзьмі на мясцовым узроўні, узрасла ў некалькі разоў. Работу дэпутацкага корпуса, органаў мясцовага самакіравання з насельніцтвам і напрамкі яе ўдасканалення разгледзелі ў першы дзень семінара на пасяджэнні адпаведнай секцыі ў Савеце Рэспублікі.

Калі да цябе прыйшоў чалавек, ты павінен дапамагчы яму

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падкрэсліла, што работа з насельніцтвам — гэта вельмі важны аспект у рабоце любога дзяржаўнага органа, любога прадпрыемства і арганізацыі. «У нашай краіне патрабаванні Прэзідэнта ў гэтым напрамку абсалютна правамерныя. У нас улада народная, сказаў Прэзідэнт, і яна жыве клопатамі аб сваіх грамадзянах. Нягледзячы на тое, што выбудавана абсалютна выразная сістэма, разам з тым мы разумеем, што актуальнасць гэтай тэмы з году ў год не сыходзіць на другі план. Яна, наадварот, з'яўляецца першараднай для ўсіх. Для нас, для членаў Савета Рэспублікі, для дэпутатаў яна вельмі важная, таму што гэта паўнавартасная крыніца інфармацыі аб тым, як працуюць законы і наколькі яны сапраўды актуальныя і эфектыўныя. Таму што тады, калі сустракаешся з людзьмі, калі чуеш іх пытанні, прапановы, пажаданні, дакладна можаш вызначыць, наколькі гэта актуальна, наколькі гэтая заканадаўчая норма запатрабаваная альбо, магчыма, ужо састарэлая», — сказала яна.

Спікер падкрэсліла, што метады і формы работы могуць быць удасканалены. Але самае галоўнае, каб яны працавалі на карысць народа і краіны. «У гэтай рабоце заўсёды трэба думаць аб тым, ці пачулі цябе людзі і ці пачуў іх ты. Вядома, бываюць розныя пытанні, бываюць вельмі няпростыя, але калі ставіцца да гэтай работы неабыякава, вынік можа быць значны. Мы жывём у той краіне, дзе ўсё робіцца на карысць людзей.

стар. 8

Своечасова вырашаць пытанні

Чаму патрэбен новы фармат міжпарламенцкай беларуска-расійскай камісіі

Напрыканцы чэрвеня ў Гродне пачне работу IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. З кожным разам колькасць кантрактаў і пагадненняў, прынятых падчас яго работы, расце. Аднак ёсць неабходнасць у аналізе і кантролі многіх рашэнняў, новых падыходах у іх здзяйсненні. Гэту функцыю ў новым фармаце павінна ўзяць міжпарламенцкая камісія.

Такая прапанова прагучала на нядаўнім пасяджэнні членаў аргкамітэта ў Гродне. Было адзначана, што цікавасць да форуму з кожным годам расце, адпаведна павялічваецца і колькасць удзельнікаў-партнёраў. Кожны бок зацікаўлены ў наладжванні новых сувязяў і пашырэнні кантактаў. Напрыклад, на сёлетнім форуме плануецца падпісаць пагадненняў на 1 мільярд долараў, а гэта на 200 тысяч долараў больш, чым на папярэднім, VIII форуме, які праходзіў у анлайн-фармаце.

Павялічваецца і колькасць рэгіёнаў-удзельнікаў. Як паведаміў падчас пасяджэння **старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ**, плануецца падпісаць каля 60 пагадненняў аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве. І заяўкі на ўдзел працягваюць паступаць.

Між тым не ўсе пагадненні і кантракты працуюць належным чынам.

Асаблівая ўвага — эканамічнаму супрацоўніцтву і тым праблемам, якія перашкаджаюць гандлёвым сувязям. Каб больш хутка вырашаць праблемныя пытанні, унесена прапанова аб перафарматаванні работы міжпарламенцкай камісіі. Яна павінна ўключыцца ў работу як на заканадаўчым узроўні, так і на ўзроўні арганізацыі. Як падкрэсліў Міхаіл Русы, зараз важна, каб такая камісія выконвала функцыю кантрольнага органа, які будзе наглядаць за ходам выканання рашэнняў, прынятых на форумах, у тым ліку і на чарговым, сёлетнім. Гэта неабходна для таго, каб зрабіць аналіз праблемных пытанняў, у тым ліку сачыць, як ідзе рэалізацыя 28 дарожных карт, бо за імі — імпартазамяшчэнне, стварэнне новых працоўных месцаў, стабільная работа эканомікі. Менавіта чарговы, IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі павінен зрабіць сур'ёзныя зрухі ў гэтым кірунку.

Разам з тым новым важным кірункам з'яўляецца навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне. Гэта сумесныя праекты і распрацоўкі, якія закліканы павысіць канкурэнтаздольнасць кампаній на знешніх рынках. Дарэчы, навуковая секцыя будзе працаваць і на IX Форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Мяркуецца аб'яднаць намаганні ў лічбавай эканоміцы для абмену сумеснымі напрацоўкамі. Менавіта ў такім кірунку працуюць многія краіны, таму і канкурэнцыя тут вельмі жорсткая.

Напрыклад, у сферы адукацыі плануецца падпісанне 10 пагадненняў паміж ВНУ абедзвюх краін. Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ**, на нядаўнім пасяджэнні камісіі разгледжаны пытанні пятай секцыі, якая прысвечана інтэграцыі сістэмы адукацыі Расіі і Беларусі на рэгіянальным узроўні. У сувязі з гэтым у ГрДУ імя Я. Купалы будзе арганізавана вялікая выстаўка, прысвечаная традыцыям і інавацыям адукацыі Расіі і Беларусі, у якой прымуць удзел звыш 20 вышэйшых навучальных устаноў дзвюх краін. Плануецца, што падчас форуму беларускія ВНУ наладзяць больш цесныя кантакты з навучальнымі ўстановамі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Тамбова, Уладзівастока і іншых гарадоў. Пагадненні, па словах сенатара, дазволяць інтэграваць як навуковыя, так і навучальныя распрацоўкі, уніфікаваць падыходы да навучання ў абедзвюх краінах.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

КАБ УЛАДЗЕ ДАВЯРАЛІ, ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Трэба разумець, што, калі да цябе прыйшоў чалавек, ты павінен яму дапамагчы. Калі не можаш дапамагчы ў рамках закона — растлумач. Не атрымліваецца — можа быць, трэба мяняць дзесьці заканадаўства для таго, каб вырашыць праблему, якая актуальная на сёння», — падзялілася Наталля Качанава.

* * *

На другі дзень работа семінара і абмеркаванне надзённых праблем праходзілі на самым высокім узроўні. У пленарным пасяджэнні прыняў удзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Разам з кіраўніком дзяржавы спецыялісты разгледзелі, як зрабіць работу з насельніцтвам на мясцовым узроўні больш эфектыўнай. Падводзячы вынікі нарады, Прэзідэнт зноў звярнуў увагу парламентарыяў на мясцовыя Саветы: «Саветы — гэта ваша вотчына, Наталля Іванаўна, Савета Рэспублікі і парламента. Гэта вертыкаль — абласныя, раённыя, сельскія Саветы. Яны безгаспадарчымі не павінны быць. Не забывайце пра гэта. Вы, сенатары, лепш, чым хто іншы, можаце рэалізаваць Саветы. Яны павінны быць пад вамі. Гэта ваша святая справа».

Многія пытанні вырашаліся ў той жа дзень

Як з насельніцтвам працуе верхняя палата парламента, падчас семінара расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ**. Ён падкрэсліў, што станоўча сябе зарэкамендавалі адзіныя дні выязных асабістых прыёмаў грамадзян у вобласці. Падобныя прыёмы ўжо праведзены ва ўсіх рэгіёнах краіны, яны ахапілі кожны раён. «Як паказала практыка, выязныя прыёмы садзейнічаюць актывізацыі работы мясцовых органаў улады. Многія пытанні грамадзян, якія запісаліся на прыём, вырашаліся неадкладна — у дзень прыёму. Непасрэдныя зносіны з людзьмі ў рэгіёнах садзейнічаюць умацаванню даверу да ўлады і фарміруюць яе станоўчы імідж. Магчымасць на свае вочы ўбачыць сітуацыю часта проста неабходна для яе паспяховага вырашэння. Гэта і практычнае навучанне спецыялістаў на месцах, як працаваць з насельніцтвам», — сказаў Міхаіл Русы.

Сенатар заўважыў, што на мясцовым узроўні хапае недапрацовак у рабоце з насельніцтвам. Напрыклад, з-за вялікай увагі да сацыяльна-эканамічных паказчыкаў развіцця рэгіёна ці прадпрыемства надзённыя праблемы людзей вырашаюцца па астаткавым прынцыпе. У выніку — недавыплачаныя пенсіі, несвоечасовая пастаноўка на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. І нярэдка людзі звяртаюцца ў вышэйшыя інстанцыі.

«Часта дапускаюцца тэхнічныя памылкі землеўпарадкавальнымі службамі пры ўстанаўленні граніцы зямельнага ўчастка. Як правіла, адказнасць вінаватых службовых асоб абмяжоўваецца дысцыплінарным спагнаннем, а пацярпелыя людзі сутыкаюцца з невырашальнымі, бывае, нават у судовым парадку, праблемамі. Рэгулярна мясцовыя органы ўлады спасылаюцца на тое, што ім складана, а часам немагчыма эфектыўна вырашаць задачы ў інтарэсах людзей з-за недастатковасці паўнамоцтваў. Але гэта не зусім так. Напрыклад, большасці выпадкаў з так званым самавольным захопам зямельнага ўчастка і самавольным будаўніцтвам пры дзеючым заканадаўстве не было б, калі б землеўпарадкавальныя і прыродаахоўныя службы, органы архітэктуры і будаўнічага нагляду, старшыні сельскіх выканаўчых камітэтаў належна выконвалі свае службовыя абавязкі. Аднак ёсць яшчэ прэцэдэнты, калі праблемы збіраюцца гадамі, людзі ходзяць па коле і рыхтуюцца кіпы матэрыялаў для разгляду ў кіраўніка дзяржавы. На жаль, фармалізм, памылкі пры прыняцці рашэнняў, неналежнае выкананне службовых абавязкаў сябе не зжылі», — адзначыў Міхаіл Русы. Сенатар звярнуў увагу на пытанні аб узмацненні ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў, асабліва ў сельскай мясцовасці. Менавіта яны павінны першымі адгукацца на праблемы і запыты людзей. Арміяй дэпутатаў у амаль 18 тысяч чалавек усё можна вырашыць на месцах.

«Органам мясцовага самакіравання трэба больш актыўна падключаць да вырашэння сацыяльна значных задач грамадскія арганізацыі і саміх грамадзян, асабліва калі гэта датычыцца бытавых пытанняў — прыбірання і азелянення прыдомавых тэрыторый, добраўпарадкавання дзіцячых пляцовак. Першы крок у фінансаванні грамадзянскіх ініцыятыў ужо зроблены: па прапанове Савета Рэспублікі кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб стварэнні грантавай сістэмы», — сказаў Міхаіл Русы.

Для эфектыўнага ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і службовых асоб з насельніцтвам неабходна актуальная заканадаўчая база. Міхаіл Русы расказаў, што экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі разгледжаны 104 заканадаўчыя акты, з якіх толькі 26 падтрымана без заўваг (25 %), па 78 выказаны заўвагі і прапановы (75 %), шэсць дакументаў не падтрымана. Гэта значыць, толькі адзінкавыя праекты з першага разу праходзяць для далейшага разгляду і прыняцця, хоць былі ўзгоднены з усімі ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі.

Асобна Міхаіл Русы звярнуў увагу на праект змяненняў у Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», які раскрытыкавалі эксперты. Шэраг ідэй супярэчылі духу гэтага механізму: замест таго, каб наблізіць прадстаўнікоў улады да людзей, прапаноўвалася абмежаваць магчымасць грамадзяніна трапіць на прыём да высокага чыноўніка, пакуль не пройдзены ўсе ніжэйшыя інстанцыі. «Гэта няправільна: чалавек павінен трапіць на прыём да таго кіраўніка, да якога ён жадае, і там яго павінны выслухаць і пачуць», — канстатаваў сенатар.

Рэсурсы для ўдасканалення ёсць

Міхаіл Русы звярнуў увагу, што рабоце з насельніцтвам трэба пастаянна вучыцца. Таму, па яго словах, варта ў кожнай вобласці і ў Мінску арганізаваць своеасаблівыя курсы павышэння кваліфікацыі па пэўных вузкіх пытаннях правапрымянення пры падрыхтоўцы рашэнняў мясцовых органаў улады, адказаў па разгледжаных зваротах. Пры праходжанні дзяржаўнымі служачымі атэстацыі на адпаведнасць займанай пасады абавязковым крытэрыем ацэнкі работы лічыць работу з калектывам і насельніцтвам, улічваць гэтыя крытэрыі пры далейшым прасоўванні па службе.

«Станоўчы вопыт таго, як у нашай краіне навучыліся працаваць з асобным грамадзянінам, трэба перанесці на работу з сацыяльнымі і прафесійнымі групамі, ініцыятывамі, суб'ектамі грамадзянскай супольнасці. Гэты пасыл адпавядае тым падыходам, якія закладзены ў падтрыманых на рэспубліканскім рэферэндуме канстытуцыйных навацыях і выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы адпаведных заканадаўчых актаў», — заявіў Міхаіл Русы.

Тэму адукацыі і кампетэнцыі прадстаўнікоў дзяржорганаў і арганізацый у сваім выступленні закранула **Вольга САЛДАТАВА, першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**. Яна расказала пра вынікі сацапытання, якое Акадэмія кіравання правяла ў снежні 2021 года. У ім прыняў удзел 461 прадстаўнік дзяржорганаў і арганізацый. Палова апытаных указала, што адчувае ў рознай ступені недахоп юрыдычных кампетэнцый, практычных і псіхалагічных навыкаў, спецыялізаваных ведаў. «А фактычна іх дзейнасць па сваёй сацыяльнай ролі супастаўная з ідэолагамі. Таму мэтазгодна перагледзець перыядычнасць павышэння іх кваліфікацыі. Яна павінна адпавядаць рэальнай патрэбе, гэта значыць, скарочана. Сістэма падрыхтоўкі кадраў павінна таксама выкарыстоўваць магчымасці перападрыхтоўкі. Ужо сёння можна ўключыць спецыяльныя дысцыпліны ў адукацыйныя праграмы, якія рэалізоўваюцца не толькі ў Акадэміі кіравання, але і ў іншых установах адукацыі», — расказала прарэктар.

Каб сфарміраваць дзейсны кадравы корпус па рабоце з насельніцтвам, з 2023 года Акадэмія кіравання адкрывае падрыхтоўку па спецыяльнасці «Сацыяльная камунікацыя ў дзяржаўным кіраванні». Па словах Вольгі Салдатавай, варта правесці рэвізію зместу існуючых спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі, у першую чаргу кіраўніцкага, юрыдычнага, эканамічнага напрамкаў, а таксама вызначыць, у якіх з іх можна прадугледзець такую падрыхтоўку.

Яшчэ адным дзейсным рэсурсам у сістэме падрыхтоўкі кадраў павінна стаць іх абавязковая самаадукацыя. «Акадэмія кіравання выказвае гатоўнасць выступіць своеасаблівым рэсурсным цэнтрам падтрымкі самаадукацыі кадраў па актуальных пытаннях работы з насельніцтвам. Рэсурсы для ўдасканалення сістэмы прафесійнай падрыхтоўкі кадраў па рабоце з насельніцтвам ёсць», — канстатавала Вольга Салдатава.

Бачыць у чалавеку чалавека

Пасля пленарнага пасяджэння семінара-нарады прадстаўнікі мясцовай улады расказалі журналістам пра свае сакрэты работы са зваротамі грамадзян. **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** прызнаўся, што для яго галоўнае — бачыць у чалавеку чалавека і размаўляць з ім на роўных, разумеючы яго праблему. «Мяняецца не толькі жыццё — мяняецца грамадства. Расце ўзровень дабрабыту — значыць, павялічваюцца патрэбы, і яны відазмяняюцца. Асабліва гэта адчуваецца ў вялікіх гарадах: паркоўкі, якасць дарог. Таму людзі заўсёды звяртаюцца. Наша задача як органа ўлады, вядома ж, — прыняць чалавека, выслухаць. І не толькі вырашаць праблемы ў індывідуальным парадку, але і на падставе зваротаў зрабіць нейкі зрэз. На што больш людзі скардзяцца, куды бюджэт павярнуць: на рамонт даху, дарогі, альбо ідэалагічны склад. Больш трэба расказваць, што адбываецца ў свеце, пра барацьбу з фэйкамі. Гэта значыць, сёння праблем шмат, і сказаць, што яны чыста ў матэрыяльным плане, напэўна, няправільна», — сказаў ён. Губернатар прызнаўся, што яшчэ ёсць, над чым працаваць і куды імкнуцца.

Па словах **намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслава ДУРНОВА**, зносіны з людзьмі трэба пачынаць на месцах: на ўзроўні сельсаветаў, ЖЭСаў, ЖЭКаў — там, дзе ў людзей узнікаюць бытавыя пытанні. «Гэта значыць, чым ніжэй мы ўзнімем гэтае пытанне — тым яго прасцей будзе вырашаць, разумеючы праблемы людзей», — растлумачыў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПОМНІКА І НАВЯДЗЕННЕ ПРЫГАЖОСЦІ

На што патрацяць прэміяльныя сродкі ў сельсаветах, якія сталі пераможцамі абласнога спаборніцтва

У папярэднім нумары «МС» расказвалася пра пераможцаў спаборніцтва паміж сельсаветамі Брэстчыны, якія занялі першае і другое месцы. Сёння знаёмім з «бронзавымі» прызёрамі. Трэцяе месца па выніках абласнога конкурсу па добраўпарадкаванні і іншых паказчыках жыццядзейнасці падзялілі Хатыніцкі сельсавет Ганцавіцкага раёна і Ляскавіцкі Іванаўскага.

Старшыня Ляскавіцкага сельскага Савета Васіль ІЛЬЮЧЫК.

— Хатыніцкі сельсавет на Ганцаўшчыне ўтвараюць тры населеныя пункты, — расказвае **старшыня сельвыканкама Аляксандр ПЕРАШЧУК**, — два аграгарадкі — Хатынічы і Раздзялавічы і невялічкая вёсачка Ялавая. У апошняй пражывае ўсяго 12 чалавек. А вось Хатынічы — даволі вялікая вёска. Насельніцтва яе складае больш за 2600 чалавек. Тут маецца ўся інфраструктура. Мы рады, што ў нас ёсць свая медыцынская ўстанова — амбулаторыя з участковай бальніцай. Стацыянар на 25 ложкаў дае магчымасць вяскоўцам прайсці курс лячэння практычна побач з домам, многія з іх у шаноўным узросце, з'яўляюцца ветэранамі працы. Ёсць таксама пяць сацыяльных ложкаў для састарэлых, адзінокіх, нямоглых.

Гандлёвае абслугоўванне тут таксама на прыстойным узроўні. Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, усяго на тэрыторыі сельсавета 15 гандлёвых пунктаў, з іх шэсць крам прыватныя, працуе два кафэ. Ёсць яшчэ такая цікавая форма абслугоўвання, як аўтакрама хлебазавода. Хлебапякарнае прадпрыемства выдзяляе транспарт і супрацоўніка, які два разы на тыдзень аб'язджае населеныя пункты і прадае сваю найсвяжэйшую прадукцыю.

Дом культуры з бібліятэкай ніколі не пустуюць. Тутэйшыя людзі здаўна любілі песні, танцы, займаюцца ў самадзейных калектывах, удзельнічаюць ва ўсіх святах і мерапрыемствах. Нязменным клопатам сельвыканкама з'яўляецца падтрыманне ў парадку вясковых вуліц, грамадскіх месцаў, памятных мясцін. Дарэчы, на тэрыторыі сельсавета размешчаны пяць помнікаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

— Самы вялікі і значны мемарыял знаходзіцца ў Хатынічах, ён стаіць на месцы брацкай магілы. Побач гарыць Вечны агонь, — расказвае Аляксандр Перашчук. — Думаю, не так многа сельскіх населеных пунктаў маюць памятнае месца з Вечным агнём. Сёлета тут прайшло мерапрыемства праекта «Кветкі Вялікай Перамогі». У канцы красавіка ў вёску завіталі прадстаўнікі 38-й дэсантнай брыгады з Брэста. Разам з членамі БРСМ, вучнямі мясцовай школы, вяскоўцамі правялі мітынг памяці, усклалі кветкі і вянкі да Вечнага агню. Мерапрыемства атрымалася даволі кранальным і памятным. На тэрыторыі нашага раёна ў гады акупацыі загінула каля дзевяці тысяч мірных жыхароў. Усе разам мы смуткавалі па ахвярах той страшнай вайны і славілі салдат Перамогі, чыімі намаганнямі была здабыта свабода.

Мы заўсёды прыходзім да гэтага помніка ў памятныя даты, прыводзім сюды дзяцей. Мемарыял даглядаем усе разам, касметычны рамонт праводзім штогод, — працягвае старшыня. — Але помнік настойліва патрабуе рэканструкцыі. І прэміяльныя грошы мы вырашылі патраціць на гэтую справу. Чакаем, што райвыканкам таксама акажа фінансавую падтрымку, каб на наступны Дзень Перамогі наш помнік сустрэў наведвальнікаў цалкам абноўленым.

Ляскавіцкі сельсавет Іванаўскага раёна прыгарадны. Гэтым

Помнік у Хатынічах, дзе пачнецца рэканструкцыя.

у многім абумоўлена спецыфіка работы. Зараз у распрацоўцы знаходзіцца шосты па ліку квартал новай забудовы. Штогод здаецца ў эксплуатацыю да 12 новых дамоў. Пачатковы кошт участкаў зямлі на аўкцыёне ў дзесяць разоў меншы, чым у райцэнтры. Таму не дзіва, што людзі, нярэдка жыхары Іванава, набываюць участкі менавіта ў Ляскавічах. Населены пункт забудоўваецца, расце колькасць насельніцтва, таму многае робіцца па яго добраўпарадкаванні.

— За апошнія два гады абсталявалі і ўладкавалі дзіцячую пляцоўку ў самым цэнтры вёскі, — расказвае **старшыня сельскага Савета Васіль ІЛЬЮЧЫК**. — Спачатку былі меркаванні ў асяродку вяскоўцаў, што гэтую пляцоўку трэба размясціць на тэрыторыі дзіцячага садка, але ж потым вырашылі ўсёй грамадой, што варта зрабіць яе даступнай для ўсіх дзяцей вёскі, у тым ліку тых, хто прыязджае да бабуль і дзядуль на лета. На гэты праект патрацілі частку аўкцыённых грошай. Варта сказаць, што пляцоўка атрымалася дыхтоўнай. Прыемна бачыць, наколькі яна запатрабаваная: дзятва літаральна не вылазіць адсюль, тым больш летнімі днямі.

У нас на тэрыторыі ёсць асаблівы аб'ект, — працягвае Васіль Іванавіч. — Гэта раённы дзіцячы прытулак. Ён размешчаны ў Ляхавічах. Установе мы таксама дапамагаем у пытаннях добраўпарадкавання, туды не так даўно паставілі арэлі, зрабілі невялікую карусель. Для дзетак, якія абдзелены бацькоўскай увагай, заўсёды хочацца зрабіць нешта добрае.

На тэрыторыі шмат робіцца ў плане добраўпарадкавання за кошт бюджэту. Не так даўно ўведзены ў эксплуатацыю дзве станцыі абезжалезвання вады, працягваецца ўдасканаленне сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення, праводзіцца падсыпка вуліц, паляпшаецца асвятленне. Скажам, па вуліцы Францыска Скарыны ў Ляскавічах летась праклалі паўкіламетра асфальту, і гэта, несумненна, стала падзеяй для жыхароў вёскі.

— Кожны дзень прыносіць новыя клопаты па добраўпарадкаванні тэрыторыі, на гэта і патрацім прэмію за перамогу ў спаборніцтве, — сказаў старшыня. — Каб больш было святла, прыгажосці, кветак — а заадно і добрага настрою на мірную стваральную працу.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Мітынг у Хатынічах.

АД СПАРТЫЎНЫХ ПЛЯЦОВАК ДА СУРДАПЕРАКЛАДУ

«Мінская змена» — генератар крэатыўных і карысных ідэй

У хуткім часе сталіцу чакае яшчэ больш цікавых і крэатыўных навацый, якія прапанавалі ўдзельнікі праекта «Мінская змена». У Мінгарвыканкаме адзначылі і ўзнагародзілі аўтараў найлепшых ініцыятыў.
Усяго ў праекце ўдзельнічала 40 чалавек, да абароны было прадстаўлена 17, восем з якіх выйшлі ў фінал. А пераможцамі сталі тры маладзёжныя праекты. Адзін з іх прадугледжвае распрацоўку інтэрактыўнай карты для інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату.
У рамках другога праекта плануецца адкрыць навучальныя курсы па жэставай мове. Трэці праект накіраваны на падрыхтоўку інфармацыйнага комплексу па павышэнні ўзроўню фінансавай адукаванасці.
Спецыяльны прыз быў уручаны маладым людзям, якія прапанавалі адкрываць ва ўсіх школах Мінска патрыятычныя клубы.

Аўтараў найлепшых праектаў узнагародзіў **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ**. «Усе праекты, якія ўдзельнічалі ў нашым конкурсе, — найлепшыя, таму што нацэлены на дапамогу людзям. Кожны ўдзельнік шмат зрабіў для таго, каб праект дайшоў да фіналу. І яны ўсе пераможцы. Мы спадзяёмся, што маладыя людзі не будуць спыняцца на дасягнутым. Самае галоўнае, каб праекты былі рэалізаваны. І мы зробім усё неабходнае, каб яны атрымалі працяг», — адзначыў ён.

Старшыня Мінскага гарадскога савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ звярнуў увагу, што кожны праект — гэта вялікі ўклад у развіццё грамадства. Па яго словах, з такім вопытам маладыя людзі могуць смела ісці па кар'ернай лесвіцы. «Вельмі прыемна, што ў нас так шмат таленавітай моладзі, якой неабыякава, што будзе заўтра. Уся вертыкаль улады імкнецца да таго, каб у моладзі была магчымасць сябе рэалізаваць. І яна сябе рэалізоўвае», — падкрэсліў старшыня Мінгарсавета.

Праект «Мінская змена» стартаваў у кастрычніку 2021 года. Яго асноўная мэта — выявіць лідарскія якасці студэнцкай моладзі. «Фактычна мы даём маладым людзям пляцоўку, дзе можна паказаць сябе з розных бакоў, паўдзельнічаць у праектах, якія ўжо сёння рэалізоўваюцца ў горадзе, унесці свае крэатыўныя ідэі. Выдатна, што наша моладзь накіравана ў правільнае рэчышча», — заўважыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА**.

Тэматыка прадстаўленых праектаў вельмі разнастайная: здаровы лад жыцця, безбар'ернае асяроддзе, прытулак для жывёл, добраўпарадкаванне горада, студэнцкае радыё. Асобна Вольга Чамаданава вылучыла ініцыятыву па патрыятычным выхаванні. Маладыя людзі прапанавалі ва ўсіх установах адукацыі, пачынаючы з першай ступені, адкрыць патрыятычныя класы.

Сёлета свае праекты прадставілі больш за 40 студэнтаў. «Мы плануем, што наступны навучальны год дазволіць нам рэалізаваць гэты праект у больш шырокім маштабе. Адна з прапаноў — стварыць тры групы з ліку моладзі. Мы будзем праводзіць напярэдадні маніторынг запыту на тыя ці іншыя тэмы, у якіх наша моладзь можа быць прадстаўлена», — падзялілася планамі Вольга Чамаданава.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

У «ДАЖЫНАК» ЁСЦЬ СТАЛІЦЫ...

і Слаўгарад рыхтуецца стаць адной з іх

Да абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі тут мяркуюць пабудаваць пяціпавярховік з ліфтам, абнавіць бальніцу, упрыгожыць горад незвычайнымі архітэктурнымі формамі.

Хоць часу да восеньскага свята хапае, у райцэнтры ўжо поўным ходам ідуць будаўнічыя работы. Створаны абласны і раённы штабы па каардынацыі работ, распрацаваны мерапрыемствы па падрыхтоўцы да свята. Васьмітысячны горад рыхтуецца прыняць шмат гасцей з усёй вобласці, і трэба стварыць умовы для таго, каб і яны, і жыхары адчувалі сябе камфортна. Карэспандэнт «МС» паназірала за тым, як мяняецца населены пункт.

...Перш за ўсё праехаліся з **архітэктарам Слаўгарада Уладзімірам НОВІКАВЫМ** па цэнтральных вуліцах горада. Народ у спяцоўках шчыруе на тратуарах і праезнай частцы. Адны раўняюць асфальт, другія кладуць плітку. Асаблівая ўвага — цэнтральным вуліцам, якія будуць задзейнічаны пад свята — Ленінскай і Кастрычніцкай. Замест старога асфальту і зношанай пліткі тратуары тут «апрануцца» ў стыльную брусчатку. Часткова правядуць і карэкціроўку дарожнага палатна.

— Гэтыя вуліцы на час фестывалю-кірмашу стануць пешаходнымі, тут размесцяцца палаткі ад прадпрыемстваў і прыватнага бізнесу, — удакладняе Уладзімір Новікаў.

Не застануцца без увагі і дамы, на фоне якіх будуць праходзіць святочныя гулянні. Сярод іх — раённы Дом культуры, дзе плануецца замяніць дах і некаторыя архітэктурныя канструкцыі.

Да восеньскага свята прымеркавана і здача першага ў горадзе жылога дома з ліфтам — 20-кватэрнага пяціпавярховіка. Па новых патрабаваннях Міністэрства архітэктуры, усе будынкі пяці і вышэй паверхаў павінны быць з ліфтамі, удакладняе суразмоўца. Будаўніцтва ідзе на вуліцы Калініна ў новым мікрараёне «Маладзёжны».

...Па дарозе да яго праязджаем яшчэ адзін «дажыначны» аб'ект — Цэнтральную раённую бальніцу. Яе капрамонт вядзецца за кошт рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. У ходзе рэканструкцыі да прыёмнага аддзялення бальніцы пабудаваны новы больш зручны пад'езд. Раней ён быў агульны для бальніцы і паліклінікі. А яшчэ адкрыўся від на сам будынак з цэнтральнай дарогі, раней ён сціпла хаваўся за прыватнымі дамамі.

Зручна і тое, што ўстанова аховы здароўя знаходзіцца непадалёк ад новага мікрараёна, куды мы едзем. Тры хвіліны на машыне, і ты ўжо на месцы. Апошнім часам «Маладзёжны» імкліва пашыраецца за кошт будаўніцтва жылля і сацыяльных аб'ектаў. Нядаўна тут быў здадзены ў эксплуатацыю дзіцячы садок. Па суседстве з новым домам — кацельная, фінансаванне якой вялося за кошт сродкаў Сусветнага банка. Аб'ект амаль цалкам гатовы да здачы. Уладзімір Новікаў кажа, што такія сучасныя кацельныя ў краіне можна пералічыць па пальцах.

Новы мікрараён цалкам гарадскі, ён быццам працяг той дарогі да Блакітнай крыніцы, якая была пабудавана пазалетась разам з мостам праз раку Сож. З вокнаў адкрываецца прыгожы від на гэты мост і парк Міявакі, які нядаўна заклалі ў Слаўгарадзе. Наогул, тэрыторыя, дзе знаходзіцца і парк, і новабудоўля, перспектыўная ў плане далейшага планавання горада.

— Слаўгарад — горад невялікі, вельмі хацелася б аддаваць перавагу двухпавярховым будынкам, — разважае архітэктар. — Але кошт «квадрата» ў іх атрымліваецца большы. Што датычыцца гэтага пяціпавярховіка, то тут будзе 16 арэндных кватэр і чатыры для шматдзетных.

Паралельна ідзе падрыхтоўка да будаўніцтва новай пажарнай часці на тэрыторыі мікрараёна. Гэта будзе аб'ект ужо больш высокіх магутнасцяў, з магчымасцю абслугоўваць жылыя дамы вышэй чым на пяць паверхаў. Ратавальнікі адзначалі, што цяперашніх «рэзерваў» ім не хапае, бо горад пачынае расці ўвышыню.

Пакуль едзем зноў у цэнтр, адзначаю, што Слаўгарад — горад зялёны: нават у спякотны дзень жыхары на яго вуліцах могуць адчуваць сябе камфортна. І гэтую «фішку» тут таксама збіраюцца абыграць.

— Будзем звяртацца да прафесіяналаў з магілёўскага «Зелянбуду», каб дапамаглі распрацаваць прыгожую канцэпцыю з зялёнымі насаджэннямі, — дзеліцца планамі архітэктар горада. — Хочацца, каб у Слаўгарадзе з'явілася як мага больш прыгожых зялёных зон. У нас ёсць свае ідэі, але хацелася б паслухаць спецыялістаў.

...Наступны наш прыпынак — 16-кватэрны двухпавярховік на вуліцы Дзяржынскага. Дом ужо апранулі ў «футра» (гэта першы будынак у райцэнтры, дзе робіцца цепларэнавацыя), хутка заменяць дах і зробяць прыгожы фасад. Каля дома знаёмлюся з адной з яго жыхарак. Жанчына прызнаецца, што зімой, мерзлі крыху, а восенню і вясной пакутавалі ад павышанай вільгаці. Будынак стары, апошнім часам стала сыпацца цэгла...

— Хутка дом будзе як новы, — запэўнівае **галоўны інжынер слаўгарадскай ПМК 274 Андрэй ХАРАЛДЗІН**. — Наперадзе — замена казыркоў, уваходных груп і вокнаў. Акрамя гэтага, прыступілі да капрамонту дома па вуліцы Карла Маркса, 9, што непадалёк. Там памяняем дах, вокны, цалкам інжынерныя камунікацыі, уцеплім фасад, зробім яго тынкаванне і афарбоўку.

Галоўны інжынер адзначае, што прадпрыемства без работы не сумавала, але тое, што ў сувязі з «Дажынкамі» яе стала больш, добра. Адпаведна, і зарплата будзе належная. Іншая справа, што з такім аб'ёмам работ самастойна не справіцца. На тэрыторыі раёна працуюць яшчэ Клімавіцкая, Чэрыкаўская і Краснапольская ПМК, хутка далучыцца і Быхаўская.

У раёне школы № 2 кіпіць работа па рамонце фасада яшчэ аднаго жылога дама. Тут працуюць прадстаўнікі з Чэрыкава і Краснаполля. Першыя займаюцца рамонтам цокаля, уваходных груп і заменай балконаў, другія фарбуюць фасад і мяняюць дахавае пакрыццё. Работы шмат, і трэба ўкласціся ў тэрміны.

— Прыязджайце бліжэй да «Дажынак», горад будзе не пазнаць, — запрашае Уладзімір Новікаў. — А на самім свяце пакажам, чым наш горад жыве. У Слаўгарада ёсць свае адметнасці, накшталт таго ж «Сырнага фэсту». Будзем імкнуцца па максімуме паказаць менавіта сваё, мясцовае, нашых пчаляроў, майстроў, рамеснікаў. Асноўныя мерапрыемствы адбудуцца на пляцоўцы каля Дома культуры, праграма рыхтуецца цікавая.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

г. Слаўгарад

Даслоўна

Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў:

— Сёння перад кожнай арганізацыяй і кожным жыхаром раёна стаіць задача ажывіць горад свайміідэямі, малымі архітэктурнымі формамі, зялёнымі кампазіцыямі. Над гэтым працуюць і ў горадзе, і на вёсцы. Цалкам загружаны работай слаўгарадскія ПМК і «Жылкамгас», на субпадрадзе працуюць рабочыя з іншых раёнаў і нават Магілёва. У рамках падрыхтоўкі да свята плануецца выканаць капітальны рамонт васьмі дамоў плошчай 8421 квадратны метр на агульную суму 2745 тысяч рублёў. Слаўгарадскім «Жылкамгасам» ужо адрамантавана 3,3 кіламетра праезнай часткі вуліц Кірава, Чырвонаармейская, Каваленкі, і работы працягваюцца. На жаль, у планах было зрабіць больш, але прыходзіцца ўкладацца ў тое фінансаванне, якое ёсць.

Але ж ёсць і прыемная навіна. На мінулым тыдні стала вядома, што мы сталі пераможцамі конкурсу на добраўпарадкаванні на ўзроўні рэспублікі. І гэтыя грошы збіраемся зноў укласці ў добраўпарадкаванне. Абновім цэнтральную гарадскую плошчу перад райвыканкамам. Яна не ўвайшла ў пералік тых аб'ектаў, якія рыхтуюцца да «Дажынак», але мы ўжо даўно хацелі яе абнавіць. Прэмія дае такую магчымасць.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2022 года.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

